Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ялы прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шапкарэй пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок шапкарэй пасьперад тэксту	1 р. — к.
За радок шапкарэй перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьвяшчэнныя на 50 проц. дарожай. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрадоўж. і чарговапрынцыпныя за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'ту—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 243 (2431) Субота, 20-га кастрычніка 1928 г.

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА ЛІСТАПАД—СЬНЕЖАНЬ НА ГАЗЭТУ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ".

НІЯКАГА АДЫХОДУ АД СУЧАСНАГА ТЭМПУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

Толькі на базе тэхнічнае перабудовы ўсяе гаспадаркі можа шырока разьвівацца сельская гаспадарка

Трымаючы НАПРАМАК на ўцягненьне вёскі ў агульнае кола сацыялістычнае перабудовы краю, даючы няшчадны адпор апартуністычнаму і трацкісцкаму ўхілам, партыя і край пойдуць НАПЕРАД ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ.

АДОЗВА ЦК УСЕКП(Б) ДА ЎСІХ ЧЛЕНАЎ МАСКОЎСКАЕ АРГАНІЗАЦЫІ УСЕКП(Б).

Дарагія таварышы!

Разьвіцьцё народнае гаспадаркі ідзе пад знакам узьдыму, пад знакам росту прадукцыйных сіл гораду і вёскі, пад знакам узмацненьня сацыялістычных элемэнтаў гаспадаркі. Мы скончылі працэс аднаўленьня народнае гаспадаркі. Мы ўступілі ў пэрыяд яе рэканструкцыі, *у пэрыяд непасрэднае сацыялістычнае перабудовы народнае гаспадаркі на базе новае тэхнікі. Гэтая перабудова немагчыма бяз усё большага разгортваньня індустрыі, як асновы індустрыялізацыі краю.* ЛЁЗУНГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ *быў і застаецца асноўным лёзунгам сацыялістычнага будаўніцтва.* Ключом-жа разьвіцьця індустрыі, а ў вядомай меры і сельскае гаспадаркі, зьяўляецца цяжкая прамысловасьць, выраб сродкаў вытворчасьці.

> „Мы ведаем,—гаворыць ЛЕНІН,—што ратункам для Расеі зьяўляецца ня толькі добры ўраджай у сялянскай гаспадарцы,—гэтага яшчэ мала,—ня толькі добры стан лёгкае прамысловасьці, якая дастаўляе сялянству рэчы спажываньня,—гэтага таксама яшчэ мала,—НАМ НЕАБХОДНА ТАКСАМА ЦЯЖКАЯ ІНДУСТРЫЯ"...«без выратаваньня цяжкае прамысловасьці, без яе аднаўленьня, мы наадолеем пабудаваць ніякае прамысловасьці. Без яе-ж мы наогул загінем, як самастойны край».

Але пэрыяд рэканструкцыі, пэрыяд перабудовы прамысловасьці і сельскае гаспадаркі на базе новае тэхнікі мае ў нашых умовах свае асаблівыя цяжкасьці, якія выклікаюць іншы раз *ваганьні* ў некаторых звеньнях партыі, але якія трэба *перамагчы*, чаго-б гэта ні каштавала, *каб дамагчыся посьпеху.*

У адзнаку ад капіталістычных краёў, мы ўзьнімаем нашую індустрыю, як цяжкую, *так і лёгкую, бяз прыстоку сродкаў з-за межаў* (без пазык капіталістаў), на аснове нашых уласных унутраных рэсурсаў, на аснове супольных сіл рабочае клясы і сялянства нашага краю. Але разьвіваць індустрыю пры нашай тэхнічнай адсталасьці такім чынам, каб не апынуцца ў хвасьце ў капіталістычных краёў, а *дагнаць* іх на справе і потым *перагнаць* іх эканамічна, як вучыў партыю Ленін, — *немагчыма без вялізарнага напружаньня сіл і сродкаў краю, без вялічэзнае вытрыманасьці і жалезнае дысцыпліны пралетарскіх шэрагаў.* Паўстаўшыя на гэтым шляху цяжкасьці—напружаньне нашых матар'яльных сродкаў, зьявішча таварнага голаду і інш.—выклікаюць некаторыя ваганьні як у асобных праслойках рабочае клясы, так і ў некаторых звеньнях самое партыі. На гэтым грунце *зьнікаюць іншы раз* настрої на карысьць перагляду асноўнага курсу партыі—настрої зьнішэць тэмпу разьвіцьця індустрыялізацыі—наогул цяжкай асабліва. Замест бальшавіцкага перамаганьня цяжкасьцяў выходзіць, такім чынам, цяканьне ад іх. Гэтыя настрої вядуць да страты пэрспэктывы сацыялістычнага будаўніцтва і выкрываюць неразуменьне таго, што *зьніжэньне тэмпу разьвіцьця цяжкае індустрыі азначала-б зьяўленьне новых яшчэ большых цяжкасьцяў у бліжэйшай будучыне, значна пагоршыла-б матар'яльны і культурны ўзровень рабочае клясы і паставіла-б наш край у цяжкую залежнасьць ад сусьветнага капіталу.*

Баронячы сучасны тэмп індустрыі, партыя грунтуецца, між іншым, на тым, што без сыстэматычнага разгортваньня індустрыі наогул, а цяжкае індустрыі—асабліва, немагчыма сур'ёзнае паляпшэньне матар'яльна-культурнага становішча рабочае клясы.

Але *індустрыялізацыя краю* ня вычэрпваецца разьвіцьцём аднае толькі прамысловасьці, лёгкае і цяжкае. Яна *азначае разам з тым разьвіцьцё сельскае гаспадаркі на новай тэхнічнай базе, забясьпечаньне індывідуальных сялянскіх гаспадарак новымі прыладамі вытворчасьці, узьняцьце іх ураджайнасьці, паступовае аб'яднаньне іх у аграмаджаныя калектыўныя гаспадаркі, арганізацыя і разьвіцьцё магутных савецкіх гаспадарак.*

Калі нельга разгортваць сельскую гаспадарку без прамысловасьці, бяз сельска-гаспадарчых машын, бяз трактараў, без мінэральных угнаеньняў, дык і прамысловасьць ня можа разгортвацца ў патрэбнай меры без узмацненьня тэмпу разьвіцьця сельскае гаспадаркі, якая дае для прамысловасьці сыравіну і харчовыя прадукты. Між тым, тэмп разьвіцьця сельскае гаспадаркі надзвычайна адстае ад росту прамысловасьці і в цяжкасьцю задавольвае ўзрастаючыя патрэбы краю, не забясьпечваючы ў патрэбнай меры сыравіннае, харчовае і экспартнае базы. Гэта, зразумела, не азначае, што сельская гаспадарка ў нас адстае, падае, ці натуралізуецца, бо *сельская гаспадарка, у тым ліку і збожжавая гаспадарка, расьце і разьвіваецца ў нас з году ў год, узьнімаючы сваю ўраджайнасьць.* Але гэта значыць, што сучасны тэмп росту сельскае гаспадаркі стаў для нас вусім нездавальняючым. Таму *паступовая перабудова* сельскае гаспадаркі на базе новае тэхнікі і масавага вытворчага каапэраваньня сялянства і ўзмацненьне, такім парадкам, тэмпу разьвіцьця сельскае гаспадаркі зьяўляецца *баявою задачай савецкае дзяржавы.*

Вялікія цяжкасьці, якія паўстаюць на гэтым шляху, натуральна выклікаюць хістаньні ў найменш устойлівых праслойках нашае партыі. У выніку гэтых хістаньняў зьяўляецца недаацэнка ролі савецкіх і калектыўных гаспадарак і імкненьне да перагляду пастаноў 15-га зьезду партыі аб узмацненьні наступу на капіталістычныя элемэнты вёскі. Гэтыя хістаньні выяўляюць неразуменьне таго, што *без перабудовы сельскае гаспадаркі на базе новае тэхнікі, каапэраваньня і калектывізму немагчыма дасягнуць магутнага ўздыму прадукцыйных сіл вёскі, вызваленьня мільённых мас сялянства ад жабрацтва і забясьпечаньня перамогі сацыялістычных элемэнтаў гаспадаркі над яе капіталістычнымі элемэнтамі.*

Гэтыя цяжкасьці, зьвязаныя з разьвязаньнем асноўных задач рэканструкцыйнага пэрыяду ў галіне прамысловасьці і сельскае гаспадаркі, яшчэ больш узмацняюцца абвастраньнем барацьбы імпэрыялістычных дзяржаў проці першае ў сьвеце пралетарскае дзяржавы. Гэта выяўляецца ў новых спробах міжнароднае буржуазеі ўсімі спосабамі перашкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву, праз падрыхтоўку эканамічнае блёкады і нападу на СССР, праз подкуп камандзнага складу прамысловасьці (Шахцінская справа) і г. д. Усе гэтыя цяжкасьці, як і само разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва на сучасным яго этапе, прыводзяць да росту актыўнасьці і барацьбы капіталістычных элемэнтаў краю (нэпман, кулак, буржуазная інтэлігэнцыя) проці палітыкі пралетарскае дзяржавы. *На сучасным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, які ў выніку вядзе да зьнішчэньня клясаў, адбываецца абвастрэньне клясавае барацьбы; апошняя асабліва востра выяўляецца ў вёсцы.*

Партыя ў сваёй палітыцы грунтуецца і ня можа не грунтавацца на вучоце абвастрэньня клясавае барацьбы ў краі, якая, між іншым знайшла свой адбітак ў сур'ёзным выпадзе кулацкіх элемэнтаў проці гаспадарчага плану пралетарскае дзяржавы ў часе леташніх хлебазагатовак. Між тым няўхільны ўсрух дробна-буржуазнае стыхіі, якая ўяўляе, не зважаючы на рост абагуленага сэктару, усё яшчэ вялізарную сілу ў нашым краі, адбіўся на страце асобнымі зьвеньнямі партыйных арганізацый выразнае клясавае ўстаноўкі.

Яшчэ ў сваім лісьце ад 13-га лютага ЦК прымушан быў адзначыць, што:

> „У нашых арганізацыях ня партыйных, так і іншых, знаходзіліся ў апошні час видомыя, чужыя партыі, элемэнты, якія не бачылі клясаў на вёсцы, не разумелі асноў нашае клясавае палітыкі і спрабавалі весьці працу такім парадкам, каб нікога не пакрыўдзіць на вёсцы, жыць у згодзе з кулаком і наогул захоўваць папулярнасьць сярод „усіх гушчаў вёскі".

Ва ўловах абвастрэньня клясавае барацьбы гэтая *недаацэнка ролі клясаў у нашым краі зьяўляецца асабліва небясьпечнаю*, бо яна абязбройвае партыю і засьпляе пільнасьць рабочае клясы. *Гэтая недаацэнка* момантаў клясавае барацьбы ўяўляе сабою адкрыта *апартуністычны ўхіл*, прадаўка для буржуазна-дэмакратычных тэндэнцый. Другі ўхіл, які ўзьнікае ад нізер'я ў справу будаўніцтва сацыялізму і ад капітуляцтва перад цяжкасьцямі, гэта — *недаацэнка значэньня саюзу рабочае клясы з сярэднім сялянствам (трацкізм).*

ПРОЦІ АБОДВЫХ УХІЛАЎ ПАРТЫЯ ПРАВОДЗІЛА І ПРАВОДЗІЦЬ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ. Як у сваім лютаўскім лісьце аб хлебазагатоўках, так і на сваіх красавіцкім і ліпнёўскім пленумах ЦК падкрэсьлівае патрабу *рашучае барацьбы* **НА ДВА ФРОНТЫ** *проці абодвых ухілаў.*

> «Партыя ў сваёй палітыцы павінна выходзіць з рашучае барацьбы як з тымі элемэнтамі, якія зьяўляюцца адбіткам буржуазных тэндэнцый у нашым краі і спрабуюць ухіліцца ад пастановы 15-га зьезду «разгортваць далей наступ на кулацтва», так і з элемэнтамі, якія імкнуцца надаць надзвычайным і часовым мерам характар отаслага ці доўгага курсу, і тым паставіць пад пагрозу справу саюзу рабочых і асноўных мас сялянства» (гл. рэзалюцыі ліпнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б). Бо *толькі на падставе ўзмацненьня саюзу рабочых і сялян пад кіраўніцтвам рабочае клясы можна скончыць пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва.*

З гэтае прычыны таксама рашуча, як змагалася партыя проці трацкізму і будзе змагацца проці яго асколкаў, яна **ПАВІННА І БУДЗЕ** змагацца проці адкрыта апартуністычнага правага ўхілу, а, значыць, і *проці прымірэнчых адносін да яго.*

У гэтай барацьбе партыі проці ўхілаў ад генэральнае бальшавіцкае лініі, у тым ліку і проці правага ўхілу, *маскоўская арганізацыя была і застаецца ў першых радох партыі.* Яна была і застаецца цьвёрдаю апораю ЦК у справе абароны і рашучага правядзеньня бальшавіцкага ленінскага напрамку нашае партыі. Яна дала сьмяротны адпор трацкісцкай апазіцыі, перамогшы ідэёвыя ваганьні асобных сваіх праслоек. Як перад 15-м зьездам партыі, так і зараз, *маскоўская арганізацыя на чале з маскоўскім камітэтам стаіць цалкам і поўнасьцю на лініі партыі*, няўхільна змагаючыся *проці розных выкрыўленьняў агульна-партыйнае лініі.* Узросшая палітычна, выхаваная ў бальшавіцкіх традыцыях, маскоўская арганізацыя выказала і выказвае вялікую чуласьць і адказнасьць у адносінах прынцыповае вытрыманасьці партыйнага кіраўніцтва, даючы рашучы адпор усім спробам замазаць агульна-партыйную ўстаноўку.

Праўда, асобныя сябры МК і кіраўнікі некаторых раёнаў вылівілі за апошні час некаторую няўстойлівасьць і ваганьне ў справе барацьбы з правымі ўхіламі ад ленінскага напрамку, дапусьціўшы няжыцьцёвыя для бальшавіцкае партыі прымірэнчыя адносіны да гэтых ухілаў. Гэтым і было выклікана нездаволеньне некаторае часткі партыйнага актыву маскоўскае арганізацыі, якое было накіравана на тое, каб выправіць такія памылкі. Нездаволеньне гэтае распачалося пасьля верасьнёўскага пленуму МК і МКК, у рэзалюцыі якога выразна не адбіліся пастановы 6-га кангрэсу Камінтэрну і пленуму ЦК аб барацьбе в правымі ўхіламі і прымірэнчымі адносінамі да іх.

Аднак, ЦК устанаўляе, што МК ужо ўжыў належныя захады для ліквідацыі дапушчаных асобных памылак; гэта адбілася ў лісьце МК ад 2 кастрычніка. ЦК заяўляе, што МК цэлым і яго кіруючы асяродак праводзіў і праводзіць напрамак партыі і безагаворачна ажыцьцяўляе пастановы яе органаў. *ЦК адхіляе гутаркі* аб тым, што МК процістаўляе сябе Цэнтральнаму Камітэту партыі, бо яны *не адпавядаюць сапраўднасьці.*

ЦК выказвае ў зьвязку з гэтым цьвёрдую ўпэўненасьць, што барацьба ўнутры маскоўскае арганізацыі, якая мела месца ў апошні час, будзе зараз-жа ліквідавана. ЦК заклікае ўсіх сяброў маскоўскае арганізацыі забясьпечыць *поўнае адзінства бальшавікоў* на аснове агульна-партыйных пастаноў і адпаведнага лісту ЦК аб неравыбарах бюро ячэек.

ЦК упэўнен, што *перавыбары бюро ячэек і падрыхтоўка да партыйных канфэрэнцый пройдуць пры спакойных таварыскіх абставінах, пад знакам шырокага разгортваньня самакрытыкі і мабілізацыі ўсяе партыйнае і рабочае масы навакол асноўных лёзунгаў нашае партыі.*

Бязумоўнае захаваньне сучаснага тэмпу разьвіцьця індустрыі.

За масавае каапэраваньне і сацыялістычную перабудову вёскі!

За саюз рабочых і вясковае беднаты з сярэднім сялянствам, на аснове забясьпечаньня кіруючае ролі рабочае клясы!

За ўздым матар'яльнага і культурнага ўзроўню рабочае клясы і працоўных мас вёскі!

Проці ваганьняў у палітыцы, за цьвёрдае ленінскае кіраўніцтва!

За згуртаванасьць і бальшавіцкае адзінства маскоўскае арганізацыі.

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б).

Замах нямецкіх банкіраў на Рапальлё.

(З Масквы па радыё).

«Известия» зьмяшчаюць такую тэлеграму з Бэрліну: «Водгук атрыманых з бэрлінскіх палітычных колаў вестак, нямецкія банкіры, якія ўдзельнічалі ў свой час ў выпуску расейскіх дзяржаўных пазык на чале з банкірскім домам Мэндэльсон, рашылі далучыцца да «міжнароднага аб'яднаньня крадыторaў Расеі» і ўзяць удзел у канфэрэнцыі гэтага аб'яднаньня, якая абудзецца ў Лёндане 23-га кастрычніка».

Наконт гэтага «Известия» ў перадавіцы пад загалоўкам «Грубая ошибка» пішуць:

Няма патрэбы напамінаць, што адмова Нямеччыны ад выплат па царскіх даўгох зьявілася ў 1922 г. ня толькі стрыжнем Рапальскага ўгавору, але і падставаю для ўсяго комплексу савецка-нямецкіх дачыненьняў, якія разьвіваюцца і мацнеюць на гэтай базе. Адмова Нямеччыны ад патрабаваньняў, якія высоўваюцца савецкай рэспубліцы з боку ўсяго капіталістычнага абкружэньня, выклікаў з боку СССР поўную гатоўнасьць да дзелавога прыцельскага супрацоўніцтва, якое даказала на працягу 6-ці гадоў абаюдную выгоднасьць і дало вельмі каштоўныя вынікі.

У сучасны момант група нямецкіх банкіраў, зацікаўленых у атрыманьні сваёй часткі царскіх даўгоў, кідае выклік ня толькі Рапальскаму ўгавору, але і ўсяму таму, што ўзьнікла на базе ўгавору за 6 з паловаю гадоў. Свае групавыя інтарэсы яны процістаўляюць інтарэсам нямецкае народнае гаспадаркі ў цэлым.

Мы думаем, што ні грамадзкая думка Нямеччыны, ні нямецкі ўрад ня могуць заставацца ў баку ад выступленьня групы нямецкіх банкіраў. Грамадзкая думка Нямеччыны ня можа быць падманута наконт значэньня таго шляху, на які штурхае яе група нямецкіх крадыторaў. Рапальскі ўгавор зьяўляецца камбінацыяй двухбаковых абавязацельстваў. Спроба зьмяніць гэтыя абавязацельствы з аднаго боку няўхільна спаткала-б карэспандуючыя імкненьні з другога. Мы чакаем выразнага адказу ад тых, хто павінен гэты адказ даць. Ніякіх нявыразнасьцяй ці двусэнсных адказаў ня можа быць дапушчана ў пытаньні, якое мае першарадную прынцыповую важнасьць у савецка-нямецкіх дачыненьнях.

ПАТЭК АБ ГАСПАДАРЧЫХ ПЕРАМОВАХ З СССР.

ВАРШАВА, 18-X. Польскае агенцтва паведамляе: польскі пасланьнік у СССР Патэк у гутарцы з супрацоўнікам газэты „Кур'ер Польскі" заявіў, што польска-савецкія гандлёвыя і прамысловыя пытаньні сталі надзвычайна актуальнымі, дзякуючы наведаньню польскай дэлегацыяй кірмашу ў Ніжні-Ноўгарадзе, а савецкай дэлегацыяй—львоўскага кірмашу. Гэтыя візыты не павінны застацца без практычных вынікаў.

„Адказныя дзеячы,—заявіў Патэк,—павінны імкнуцца весьці творчую працу і ня спыняць распрацоўкі згод дзеля разьвіцьця эканамічных дачыненьняў між Польшчаю і СССР на аснове натуральных пэрспэктыў гэтага разьвіцьця. На гэтай ідэі в грунтую пляны сваёй працы пасьля звароту ў Маскву".

Балканы ў кулаку англа-францускага імпэрыялізму

АТЭНЫ, 13-X. Не зважаючы на дэманстратыўна-нацыянальную і мірную палітыку Вэнізэлёса, Грэцыя, на думку тутэйшага апазіцыйнага друку, ня можа выйсьці з-пад уплыву ангельскіх кансэрватараў. Водгук апазіцыйных газэт і добра асьведамленых колаў, Францыя ў выніку згоды з Англіяй набыла волю ўчынкаў на Балканах, усё роўна як раней яе мела Італія. Раней Англія рабіла праз Італію нажым на Францыю, а зараз яна робіць яго на Італію праз Францыю. Гэта ўжыта в мэтаю стварыць балканскае Лёкарно, уцягнуць Турцыю ў кола эўрапейскае палітыкі, узмацніць антысавецкі фронт і палегчыць дастаўку вайсковых прыладаў Польшчы і Румыніі праз Салонікі ў выпадку вайны.

Мусаліні пераходзіць да адкрытых забойстваў.

ВЫКЛІК МІЖНАРОДНАЙ РАБОЧАЙ КЛЯСЕ.

ПАРЫЖ, 18-X. «Юманітэ», а таксама лева-буржуазны і сацыялістычны друк востра пратэстуюць проці сьмертнага прысуду італьлянскаму камуністу Дэла Маджорэ, ухваленаму фашысцкім надзвычайным трыбуналам у Лукку за забойства 2-х фашыстаў.

«Юманітэ» піша: «Пасьля тайных забойстваў у астрозе фашызм пераходзіць да адкрытых, узаконеных забойстваў. Прысуд у Лукку—ганебны фашысцкі выклік да сусьветнага пралетарыяту. Прысуд надзвычайнага трыбуналу накіраван проці пралетарыяту ўсяго сьвету».

ПОЛЬСКА-НЯМЕЦКІЯ ПЕРАМОВЫ АБАРВАНЫ.

БЭРЛІН, 18-X. Нямецка-польскія перамовы аб гандлёвым угаворы, якія адбываліся ў Варшаве, перарваны, бо польскі ўрад лічыць, што адказ нямецкага ўраду на апошнія прапановы Польшчы ня можа служыць здавальняючаю базаю для перамоў.

АДСТАЎКА ЛЁРДА БІРКЕНХЕДА.

ПАЛІТЫКУ ЗЬМЯНІЎ НА КАМЭРЦЫЮ.

ЛЁНДАН, 18-X. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: «Лёрд Ціль назначан міністрам па справах Індыі замест Біркенхеда, які падаўся ў адстаўку, спасылаючыся на намер прысьвяціць сябе камэрцыйнай справе.

Біркенхед вьярнуўся да прэм'ера з лістом, у якім заяўляе, што пазаўсёды адыходзіць ад палітыкі, аднак, выказвае поўную салідарнасьць з Бальдвінам і яго калегамі па габінэце.

ПАЛЁТ ПРАЗ ПАЎНОЧНАЕ КАНЦАВОСЬСЕ НА „ЦЭПЕЛІНЕ".

БЭРЛІН. Сэсія дасьледчых камісій міжнароднага таварыства Аэраарктык (таварыства для вывучэньня Арктыкі пры дапамозе паветраных апаратаў; сэсія адбываецца зараз у Бэрліне) распрацавала палярнае экспэдыцыі на дырыжаблі тыпу «Цэпелін», які зрабіў гэтымі днямі транс-атлянтычны палёт. Экспэдыцыя адбудзецца на той год у красавіку ці маі. Дырыжабль пераляціць арктычную вобласьць два разы,—абодвы разы па маршруце: паўночная Эўропа—Аляска і назад. Эўрапейская база экспэдыцыі будзе ў Мурманску ці Ленінградзе, а амэрыканская—у Неме (Аляска). Адлегласьць між паўночнаю Эўропаю і Аляскаю складае прыблізна 7 тысяч кіляметраў.

ВАЙНА МІЖ ФЫН-ЮЙ-СЯНАМ І ЯГО ПАДНАЧАЛЕНЫМ.

ПЕКІН, 15-X. Японскае агенцтва паведамляе, што генэрал Лю-Чжэн-Ніп адмовіўся падначаліцца загаду Фын-Юй-Сяна, які патрабуе эвакуацыі войска з Цьзяндуна. Лю-Чжэн-Ніп арыштаваў і растраляў 6 прадстаўнікоў Фын-Юй-Сяна, якія прыехалі гэты загад.

Фын-Юй-Сян рыхтуе ваеннае выступленьне проці Лю-Чжэн-Ніна.

Новы турэцкі пасланьнік у СССР.

АНГОРА, 18-X. Анаталійскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «Пасланьнік Турцыі ў Будапэшце Басіфбей назначан паслом Турцыі ў Маскву».

Рэнегаты КПЗУ пад абаронаю пілсудчыны.

ВАРШАВА, 18-X. Улада зачыніла выходзіўшую ў Львове украінскую газэту «Світло», якая нядаўна ў вострай форме адмежавалася ад прыхільнікаў Шумскага.

Ні кроку назад ад пастаноў XV зьезду

—АДНАДУШНА СКАЗАЛА ЛЕНІНТРАДЗКАЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ.

ЛЕНІНГРАД, 19-X. 18-га кастрычніка пленумы калектываў буйных прадпрыёмстваў Ленінграду падсумоўвалі вынікі 6-га пленуму абласнога камітэту УсеКП(б). На адчыненых пленумах калектываў у прысутнасьці камсамальцаў і беспартыйных рабочых рабілі даклады аб выніках пленуму т. Кіраў (на „Красном Путиловце"), Озэрн (на «Большевике»), Камароў (на «Балтийском»), Угараў (на «Красном Выборжце») і інш. Пленумы з асаблівае здаволенасьцю адзначылі аднадушнасьць і згуртаванасьць, з якімі ленінградзкі абласны камітэт УсеКП(б) дае рашучы адпор усім апартуністычным ухілам.

«НІВОДНАГА КРОКУ НАЗАД АД ПАСТАНОЎ 15-га ЗЬЕЗДУ» аднадушна сказала ленінградзкая партыйная арганізацыя.

Сход партактыву Петраградзкага району, заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад аб выніках працы кастрычніцкага пленуму абласнога камітэту УсеКП(б), цалкам і поўнасьцю ўхваляе ўсе пастановы абласнога камітэту УсеКП(б). Сход заклікае ўсіх сяброў партыі павесьці самую рашучую і сыстэматычную барацьбу, як з рэшткамі контр-рэвалюцыйнае трацкісцкае групоўкі, так і з захаваньнем правымі апартуністычнымі элемэнтамі ў радох нашае партыі.

Польскі пралетарыят не адступіць.

Стачачнікі-лодзінцы прадаюць апошнія пажыткі для прахарчаваньня, але аб капітуляцыі і ня думаюць.

На вуліцах Лодзі ўсё часьцей выгукі ў чэсьць СССР

ВАРШАВА, 18-X. Згодна пастановы акруговае камісіі прафсаюзаў служачыя больнічнае касы спынілі ўчора забастоўку. Вярнулася да працы і частка неарганізаваных кельнераў, тэатральных служачых і беспрацоўных, занятых на грамадзкіх земельных працах.

Лодзінскія мэталёўцы, якія далучыліся з першага дню да ўсеагульнае забастоўкі, патрабавалі павялічыць заработак на 20 проц. Прадпрыёмцы адхілілі патрабаваньне. Тады дэлегацыі мэталёўцаў заявілі прадпрыёмцам, што мэталёўцы бастуюць з гэтага моманту ня толькі ў знак салідарнасьці з тэкстыльшчыкамі, але і ў абарону ўласных патрабаваньняў. Штрэйкбрэхераўскія арганізацыі, адчуваючы пікчэмнасьць сваіх сяброў у Лодзі, напружваюць усе сілы, каб сарваць забастоўку ў Лодзінскай акрузе.

На Жырардаўскай фабрыцы рабочыя абвясьцілі італьлянскую забастоўку. Адміністрацыя фабрыкі заявіла, што калі ў выпадку прадоўжаньня забастоўкі ня спыніцца, дык будзе абвешчан лёкаут усіх рабочых.

Не зважаючы на энэргічнае супрачаньне пэпэсаўцаў, у Варшаве ўсьлед за буйнаю тэкстыльнаю фабрыкаю «Воля», да забастоўкі лодзінскіх тэкстыльшчыкаў далучыліся рабочыя некалькіх мясцовых тэкстыльных прадпрыёмстваў. Варшаўскія мэталёўцы падалі прадпрыёмцам шэраг эканамічных патрабаваньняў. Пэпэсаўцы напружваюць усе сілы, каб адхіліць абвешчаньне забастоўкі.

Абурэньне ў Лодзі проці спроб пэпэсаўцаў сарваць забастоўку праз арбітраж выклікала шэраг стычак. Памяшканьні ўсіх прафсаюзных арганізацый шчыльна замыкаюцца перад усімі рабочымі, западозранымі ў лявізьне. Бастуючыя, якія сабраліся перад памяшканьнем прафсаюзу тэкстыльшчыкаў, сілаю прымусілі старшыню прафсаюзу тэкстыльшчыкаў пэпэсаўца Шаркоўскага выступіць са справаздачаю. Абурэньне рабочых, аднак, нагэтулькі ўзрасло, што Шаркоўскі ня здолеў гаварыць.

Пад'ехаўшы камуністы далі магчымасьць Шаркоўскаму сказаць прамову, якое ён усё-ж такі ня скончыў, бо рабочыя праравалі яго сьпевам «Інтэрнацыяналу».

Перад фабрыкаю Пазнанскага адбылася дэманстрацыя рабочых на чале з камуністамі. Дэманстрацыі адбыліся і перад будынкам, дзе зьмяшчаецца акруговая камісія прафсаюзаў. Усе дэманстрацыі разагнаны паліцыяй. Зазначаюць, што ў стычках з паліцыяй усюды ўзмацняецца адпор рабочых.

Сярод бастуючых адчуваецца крайняя пакута. Дапамога гарадзкога самакіраўніцтва, якое выдае штодня 5 тысяч хлебных пайкоў і 10 тысяч абедаў, зьлічэньваецца кропляй у моры беднасьці. Дапамога ад рабочых арганізацый надсылаецца марудна. Небагатая маемасьць рабочых прадаецца задарма на рынку.

Лодзінскі карэспандэнт газэты «Кур'ер Поранны» піша, што ўвечары асьвечан толькі цэнтр гораду. Усе другарадныя вуліцы і заваліцы гораду застаюцца ўпацёмках. Аўтамабілі на вуліцы ня відаць. Карэспандэнт апавядае, што яму ледзь удалося дастаць аўтамабіль, і ён езьдзіў па горадзе пад варожыя выгукі рабочых: «Буржуй; напэўна ўрадавы дэлегат з Варшавы». Далей карэспандэнт апісвае галодных і зьмізарнёўшых рабочых, якія з прагнасьцю накідаюцца на хлеб гарадзкога кіраўніцтва. Карэспандэнт заявае, што рабочыя прадаюць лахвярам свае апошнія лахманы, але пра капітуляцыю ня думаюць. Пра рост рэвалюцыйных настрояў сярод мас карэспандэнт піша: На вуліцах Лодзі ўсё часьцей чуюцца выгукі: «Няхай жыве СССР».

Нарада ў міністэрстве працы бяз вынікаў.

ВАРШАВА, 18-X. Прадпрыёмцы лодзінскае тэкстыльнае прамысловасьці пасылі ў Варшаву на канфэрэнцыю ў міністэрства працы толькі некалькі сваіх чыноўнікаў, падкрэсьліваючы гэтым, што яны не асабліва зацікаўлены ў ліквідацыі забастоўкі.

Левыя прафсаюзныя групоўкі, водгук слоў органу Бунда «Фолькс Цайтунг», адмовіліся ўзяць удзел у канфэрэнцыі.

Першае пасяджэньне канфэрэнцыі прадстаўнікоў прадпрыёмцаў і рабочых у міністэрстве працы не дало ніякіх вынікаў. Наступны пленум канфэрэнцыі назначан сёньня на 6 гадзін увечары.

НПР, як і ППС, выступае штрэйкбрэхерам.

ВАРШАВА, 18-X. Як паведамляюць з Лодзі, на дапамогу пэпэсаўцам, у спробах сарваць забастоўкі, выступае і народная рабочая партыя (НПР). Эпэсаўцы радзяць зьмятчыць забастоўку, спасылаючыся на тое, што між прадпрыёмцамі і прадстаўнікамі рабочых ужо пачаты перамовы ў міністэрстве працы.

Забастовачны камітэт ухваліў рэзалюцыю, у якой ганьбіць штрэйкбрэхерскія спробы НПР. Такую-ж рэзалюцыю прымушана была ўхваліць яго націскам рабочых мас пэпэсаўская акруговая камісія прафсаюзаў.

Раскол у ППС стаў фактам.

Абедзьве расколатыя групы---аднаго поля ягады. Напрамак „новае" ППС на фашызацыю рабочага руху.

ВАРШАВА, 18-X. У апошнія дні барацьба ўнутры ППС набыла рашаючыя формы. Далей хаваць насьпяваючага расколу было нельга.

Сёньня раскол у ППС стаў фактам, ЦК абвясьціў варшаўскі камітэт ППС умоўна выключаным з партыі, калі ён да 19 кастрычніка ня выступіць з публічнаю заявою аб сваім падначаленьні цэнтральнаму камітэту. У адказ на гэта варшаўскі камітэт разам з прэзыдыумам некалькіх варшаўскіх прафсаюзаў, на чале якіх стаяць прыхільнікі Яваройскага, ухваліў рэзалюцыю аб непадначаленьні цэнтральнаму камітэту ППС.

Сёньня «Пшэдсьвіт» паведамляе аб заснаваньні новае партыі пад назваю «ППС (ранейшая рэвалюцыйная фракцыя)» У адозьве новае партыі зазначана: «Ле адносіны да ўраду будуць дзелавыя. У сваёй працы яна будзе кіравацца ідэямі клясавага рэвалюцыйнага сацыялізму». Наперадзе адозва заклікае ўсе пэпэсаўскія арганізацыі далучыцца на новае партыі.

На ўчарайшым рашаючым пасяджэньні варшаўскі камітэт прафсаюзаў ухваліў рэзалюцыю, у якой заклікае да «ўсямернае дапамогі бастуючым лодзінскім тэкстыльшчыкам». Такім парадкам, група Яваройскага, выкарыстоўваючы спудаванасьць ЦК ППС перад лодзінскімі падзеямі, імкнецца нажыць палітычны капітал на лодзінскай забастоўцы. Надумку палітычных колаў, пэпэсаўцы-пілсудчыкі, якія знаходзяцца ва ўрадавым лягеры, спрабуюць гэтым крокам праклясьці шлях да непасрэднага ўрадавага ўплыву на рабочых.

Выстаўка харчаваньня ў Бэрліне.

(УРАЖАНЬНІ ЎДЗЕЛЬНІКА).

З 5 мая да 12 жніўня ў Бэрліне адбывалася выстаўка харчаваньня. Выстаўка зьмяшчалася ў спэцыяльна пабудаваных для выставак павільёнах. Гэтай выстаўкай былі заняты 3 вялікія павільёны і 5 меншых, а часьць выстаўкі разьмяшчалася проста на плошчы. Як месца выстаўкі, так і павільёны сваёй удалай пляноўкай, тэхнікай пабудовы і наогул усім сваім выглядам рабілі надзвычайна прыемнае ўражаньне. Асабліва прыгожа выглядала выстаўка ўвечары і ўначы, калі яна залівалася морам электрычнага сьвятла.

У арганізацыі выстаўкі прынялі ўдзел розныя навуковыя ўстановы Нямеччыны, пераважна медыцынскія і сельскае гаспадаркі, а таксама розныя фірмы апрацоўкі і вытворчасьці харчавых прадуктаў, фірмы вытворчасьці машын для харчавой прамысловасьці і хатняга ўжытку і шэраг іншых устаноў і асоб, прадукцыя якіх мае тое ці іншае дачыненьне да народнага харчаваньня.

Арганізацыя і зьмест выстаўкі надзвычайна ўдалыя і ўсебакова цікавыя. Тут было прадстаўлена ня толькі харчаваньне ў вузкім сэнсе гэтага слова, а і ўсе галіны навукі і практыкі, маючыя сувязь з харчаваньнем.

Наогул, гэта выстаўка ўяўляла сабой у значнай меры выстаўку народнае гаспадаркі, бо побач з гігіенай харчаваньня былі поўна прадстаўлены крыніцы прадуктаў харчаваньня—сельская гаспадарка, забясьпечка насельніцтва прадуктамі харчаваньня, тэхніка апрацоўкі іх і наогул харчавая прамысловасьць.

Але, ня гледзячы на ўсебаковасьць і масавасьць выстаўкі, усё было ўмела і ўдала разьмешчана і ўвязана паміж сабой у адно цэлае. Кожнаму наведальніку было над чым спыніцца, было на што паглядзець, павучыцца. Гэта выстаўка шмат давала гледачам як з навуковага, так і практычнага боку. Пры гэтым трэба адзначыць, што, дзякуючы навукова-папулярнаму падыходу ў арганізацыі, выстаўка была цікава і зразумела шырокім масам насельніцтва.

Добра арганізавана было абслугоўваньне выстаўкі. Апрача зразумелых надпісаў, па якіх глядач сам мог разабрацца, меліся групаводы з студэнтаў, якія вадзілі арганізаваныя групы гледачоў, тлумачачы зьмест і значэньне кожнага экспанату і маделі, кожнае дыяграмы і г. д., што давала магчымасьць звычайным наведвальнікам хутчэй абысьці вялізную выстаўку.

Цікавы зьмест выстаўкі добра быў папулярызаваны праз друк.

Больш за ўсё наведваўся павільён тэхнікі і харчавое прамысловасьці, які заўсёды быў повен. Выстаўка была адчынена ад 8 гадз. раніцы да 7-й гадз. вечара. Разавы ўваход адзіночным парадкам—1,5 (75 к.) маркі, на некалькі дзён і групамі—таньней.

Аднаго толькі савецкі наведвальнік ня мог знайсьці на гэтай выстаўцы: адсутнічаў той напрамак народнага харчаваньня, які ў умовах нашага сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца надзвычайна важным і на што ў нас зварочваецца вялікая ўвага,—гэта грамадзкае харчаваньне. З масавых форм харчаваньня прадстаўлена была пастаноўка харчаваньня ў турмах, больніцах, вайсковых частках, на параходах, а з больш слізкіх форм да сапраўднага грамадзкага харчаваньня—харчаваньне ў дзіцячых садох, у школах сацыяльнага забесьпячэньня і харчаваньне ў часе народных нягчасьцяў. Усе было прадстаўлена пераважна ў разрэзе індывідуальнага харчаваньня і прыватнае кухні. У гэтым разрэзе выстаўка была надзвычайна цікавай. Тут, у індывідуальным харчаваньні шмат было чаго такога, што можна запазычыць і выкарыстаць у грамадзкім харчаваньні, асабліва з навуковага боку ў галіне гігіены і фізіялёгіі харчаваньня.

Зьмест і аб'ём выстаўкі настолькі вялікі, што кожны павільён і аддзел заслугоўваюць асобнага апісаньня.

Д-р Магілеўчык.

Працоўныя Беларусі—на дапамогу бастуючым рабочым Лодзі.

БАРЫСАЎ. Рабочыя і служачыя запалкавай фабрыкі **«ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА»** на агульным сходзе заслухаўшы інфармацыю аб ходзе забастоўкі ў Лодзі, аднагалосна пастанавілі адлічыць 2 проц. месячнай заработнай платы, што складае 1500 р.

* * *

Рабочыя гуты **«ДОМБАЛЬ»** пастанавілі адлічыць паўдзённы заработак.

* * *

Рабочыя і служачыя **БАРЫСАЎСКАГА КАМБІНАТУ** пастанавілі адлічыць 2 проц. месячнага заработку.

* * *

На астатніх фабрыках і заводах таксама ідзе збор сродкаў на карысьць лодзінскіх бастуючых рабочых.

* * *

Учора адбыўся агульны сход служачых **БЕЛАРУСКАГА ХАРЧОВАГА ТРЭСТУ**, на якім была заслухана інфармацыя аб забастоўцы ў Лодзі.

Сход пастанавіў адлічыць 1 проц. месячнага заработку.

* * *

18 настрычніка адбыўся агульны сход рабочых **ШАВЕЦКАЙ МАЙСТЭРНІ «ТОРГСТРОЙ»**.

Быў заслухан даклад аб усеагульнай забастоўцы ў Лодзі. Заслухаўшы даклад сход пастанавіў адпрапаваць 2 гадзіны на карысьць бастуючых рабочых Лодзі.

* * *

Учора на **ПРАДПРЫЁМСТВАХ БАБРУЙСКУ** адбыліся мітынгі рабочых, прысьвечаныя падзеям у Польшчы. Арганізаван збор сродкаў да дапамогу бастуючым лодзінскім пралетарыям.

* * *

— Агульны аб'яднаны сход **СУПРАЦОЎНІКАЎ РЭЗІНАТРЭСТУ і «ТЭЖЭ»**, на якім была заслухана інфармацыя аб забастоўцы рабочых—тэкстыльшчыкаў Лодзі, пастанавіў адлічыць ў карысьць бастуючых 1 проц. месячнага заработку.

КРАВЕЦКАЯ АРЦЕЛЬ «ЕДИНЕНИЕ» сабрала на карысьць лодзінскіх рабочых 145 рублёў.

* * *

СЯРОД РАБОЧЫХ ЗАГАТОВАЧНАЙ АРЦЕЛІ «ПРАЦА», дзе працуюць 20 чал., сабрана 150 руб. на карысьць лодзінскіх рабочых.

* * *

АГУЛЬНЫ СХОД ПРАЦКАЛЕКТЫВУ «ЧЫРВОНЫ ТЭКСТЫЛЬШЧЫК» пастанавіў адлічыць на карысьць лодзінскіх рабочых 1 проц. месячнага заработку, што складае 150 р.

* * *

РАБОЧЫЯ СКУРАНОГА ЗАВОДУ «БАЛЬШАВІК» пастанавілі адлічыць на дапамогу бастуючым рабочым паўдзённы заработак, што складае каля 500 руб.

* * *

РАБОЧЫЯ ШЧОТАЧНАЙ ФАБРЫКІ пастанавілі адлічыць на дапамогу бастуючым рабочым Лодзі 1 проц. ад месячнага заработку.

* * *

Агульны гарадзкі сход менскіх асьветнікаў прайшоў з вялікім уздымам. Па дакладу аб падзеях у Польшчы асьветнікі пастанавілі паслаць шчырае прывітаньне барацьбітом-пралетарыям г. Лодзі. Асьветнікі не застанавіліся на адным прывітаньні і аднадушна пастанавілі адлічыць 1 проц. з месячнага заработку на карысьць бастуючых рабочых Лодзі.

* * *

АГУЛЬНЫ СХОД СУПРАЦОЎНІКАЎ НАРКАМФІНУ пастанавіў адлічыць на карысьць бастуючых рабочых г. Лодзі 1 проц. месячнага заработку.

— Агульны сход **РАБОЧЫХ ЦУКЕРАЧНАЙ ФАБРЫКІ МЕНСКУ**, заслухаўшы на агульным сходзе даклад аб усеагульнай забастоўцы рабочых Лодзі, пастанавіў адлічыць у карысьць бастуючых паўдзённы заработак.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Плян сяўбы выканан.

Цяпер ужо можна падагуліць вынікі асеньняй пасяўной кампаніі, якая паказала, што пры належнай увазе і працы нашых крэдытных таварыстваў і савецкіх устаноў заўсёды можна мець посьпехі ў працы.

Сёлата асабліва была зьвернута ўвага на кантрактацыю пасеваў азімага жыта, якая выканана па Ціхінскаму сельска-гаспадарчаму таварыству на 110 проц. Калі ўзяць вёску В.-Крушынаўку, якая ў веснавую пасеўную кампанію і на рубля не закантрактавала, дык цяпер на пасеў азімага жыта закантрактавана на суму 300 р.

Ачыстцы насеньня таксама была зьвернута ўвага з боку грамадзкіх арганізацый, так, арфа па ачыстцы жыта працавала два месяцы.

Агранамія як заўсёды яшчэ не зьяўляецца штурхачом усіх пачынаў; якраз у асеньнюю сяўбу райаграном стаў пераводзіцца ў другую рэспубліку, а памоцнікі агранома пасхалі вучыцца.

Сёлета значная колькасьць пасеву жыта рабілася на зялёным угнаеньні—лубіне, а таксама на мінэральных угнаеньнях, якія ўжо ўжываю і сялянства.

Наогул намечаны плян сяўбы выканан, дзякуючы руплівасьці гаспадарчых устаноў і своечасоваму згрупаваньню думкі вакол гэтага пытаньня.

Бабруйшчына.

Больш увагі збору с.-г. падатку.

Гомель, 19-10. Паступленьне сельска-гаспадарчага падатку ў акрузе праходзіць слаба. Па 15-ае кастрычніка паступіла 371387 руб., што складае 95,14 проц. заданьня 1 тэрміну.

Першае месца па збору сельска-гаспадарчага падатку займае Камарынскі райён, выканаўшы 177,57 процантаў першага тэрміну і 35,51 проц. да агульнага заданьня. Другое месца займае Брагінскі райён, выканаўшы 115,47 проц. 1-га тэрміну і 23,09 проц. агульнае сумы сельска-гаспадарчага падатку. Буда-Кашалёўскі райён выканаў 91,26 проц., Церахоўскі—93,27 проц.

Асабліва адстае Лоеўскі, Рэчыцкі, Уваравіцкі і Веткаўскі райёны. Райвыканкомы на збор сельска-гаспадарчага падатку не зьвяртаюць належнае ўвагі. Падатак паступае самацёкам.

У зьвязку з гэтым прэзыдыум акрвыканкому прапанаваў райвыканкомам узмацніць увагу збору сельска-гаспадарчага падатку. Уся адказнасьць за своечасовае паступленьне сельска-гаспадарчага падатку ўскладзена на старшынь райвыканкомаў. Вінаватыя ў паслабленьні ўвагі да сельска-гаспадарчага падатку будуць прыцягнуты да адказнасьці.

Загатоўкі будуць павялічаны.

Магілёў, 19 X. Па жыту першая дзесяцідзёўка кастрычніка дала па акрузе каля 35 проц. месячнага заданьня—5547 пудоў.

Па яравых у абсалютных лічбах загатоўлена больш супроць папярэдняй дэкады (паступіла 5429 пудоў), але-ж процант месячнага пляну невялікі (22,5 проц.), бо на кастрычнік пляновае заданьне па яравых павышана.

Паступленьне памольнага збору ўвесь час трымаецца на вышыні і ў апошнюю дзесяцідзёўку таксама выпаўнена 44,7 проц. месячнага заданьня.

Па Ільнасемю—вельмі добра: за дэкаду выпаўнен увесь месячны плян нават з перавышэньнем.

Беднату вызвалілі ад аплаты страховых узносаў.

(Ліст з Рагачоўскага раёну, Бабруйшчына).

Налічэньне страхавых плацяжоў на асобныя гаспадаркі па райёну пачалося. Страхавыя платэжы будуць павышаны на 20 проц., бо павышаны стаўкі і ацэнены па вышэйшых стаўках будынкі сялянства, але гэта ня сьведчыць, што страхоўка будзе непасільна для бедняка.

Для скідак беднаце на В-Крушынаўскі сельсавет прадастаўлен фонд ў ліку 395 р.

Пытаньне вызваленьня ад страхоўкі беднаты абгаварвалася на сходзе беднаты, на пасяджэньні страхупаўнаважаных і на пленуме сельсавету.

Я. Крушына.

Безгаспадарчасьць у т-ве „Дапамога".

БАРЫСАЎ, 19-X. Барысаўскі райвыканком прапанаваў т-ву „Дапамога" пачаць загатоўкі сена і бульбы.

Замест таго, каб купіць гэтае сена і бульбу ў сялян, альбо калгасах—т-ва «Дапамога»—пачало праводзіць загатоўкі праз штат спэцыялістаў, якія надбаўлялі ў наштоўнасьці на пуд сена па 30 і болей капеек.

Некалькі тысяч пудоў сена складвалася на адкрытым мейсцы і не прыкрывалася брызэнтам. У выніку вялікая колькасьць сена згніла.

Гнілое сена пачалі прадаваць насельніцтву па 30 кап. пуд. (сабекошт сена 1 руб. і болей за пуд), але насельніцтва не жадае яго купляць.

Таксама загатоўленая бульба папсавалася і замест сабекошту пуда бульбы—1 р., яна прадаецца па 30 кап.

Дзяржава з-за безгаспадарчасьці і галавацяпства працаўнікоў Барысаўск. т-ва „Дапамога" панесла вялікія страты.

Да адказнасьці безгаспадарнікаў.

ПАШЫРЭНЬНЕ ВЫПРАЦОЎКІ ЦЭГЛЫ.

ГОМЕЛЬ, 19-X. Прэзыдыум акрвыканкому прапанаваў «Кустпрамсаюзу» распачаць працу па арганізацыі недалёка ад Гомелю арцеляў па выпрацоўцы цэглы. Арцелі павінны быць арганізаваны з такім разьлікам, каб апошнія маглі выпусьціць да 3 міліёнаў штук цэглы.

Апрача гэтага, прэзыдыум узьняў пытаньне перад Эканомнарадай БССР аб водпуску сродкаў з сум, прызначаных для крэдытаваньня цагляное прамысловасьці, на арганізацыю арцеляў па выпрацоўцы цэглы.

Разьмеркаваньне ляснога ільготнага фонду.

ГОМЕЛЬ. 18-X. Прэзыдыум акрвыканкому разьмеркаваў ільготны фонд на драўніну на пагарэльцаў і бядняцкіх гаспадарак на 45 тысяч руб. З іх па райёнах 39 тыс. р., для разэрву 5 тыс. р., для калектыўных гаспадарак 1000 р.

Апроч таго, прэзыдыум разьмеркаваў па райёнах фонд крэдытаваньня на набыцьцё ляснога матар'ялу ў суме 105 тыс. р.

Райвыканкомам прапанавана ільготны лясны фонд разьмеркаваць па селішчах.

Як ідуць загатоўкі.

Загатоўка лёну.

(Ліст з Віцебску).

Ураджай валакна лёну сёлета па Лёзьненскаму райёну ў сярэднім 16-17 пуд. з дзес. замест леташніх 12-13 пуд. У паасобных гаспадарках збор валакна дасягае нават больш 20 пуд. з дзесяціны.

У слянцовых райёнах Віцебшчыны да 10 кастрычніка лён быў ужо ўбраны і толькі частка лёну, з прычыны позьняй уборкі, ня была яшчэ выстлана.

У мачанцовых райёнах (Гарадокскі і Высочанскі) частка лёну да 10 кастрычніка ня была ўбрана. Сабраны-ж лён у значнай частцы зьняты недасьпелым, што, бязумоўна, адаб'ецца на загатоўцы семя лёну ў гэтых райёнах. Ёсьць небясьпека, што нябраны з палёў лён ня будзе сёлета замочаны і выкінуты на рынак.

Трэба адзначыць, што якасьць валакна лёну, якое ўжо пачало паступаць на рынак, значна вышэйшая ад леташняга. Па Лёзьненскіму райёне ўжо загатоўлена да 1000 пуд. валакна і 20.000 пуд. семя лёну. Якасьць семя таксама ня горш леташняга.

У мачанцовых-ж райёнах загатоўкі праходзяць надзвычайна слаба і семя загатаўляецца ў недасьпелым відзе. Яно прыгодна толькі для прамысловасьці, але не для пасеву.

У сувязі з высокімі цэнамі на жыта (4 р.—4 р. 50 к. пуд.) і авёс (2 р.—2 р. 50 к. пуд.) пры цане на семя лёну ў 2 р. 15 к. пуд., ёсьць небясьпека, што сяляне будуць прымешваць апошнае пры перамоле жыта і аўса на харч жывёле, а таму неабходна будзе ўзмацніць завоз хлебафуражу ў гэтыя райёны.

Нізавы загатоўчы апарат ніякай ініцыятывы ў сэнсе вывучэньня сваіх райёнаў не праяўляе. Цікава адзначыць, што не ў базарныя дні загатавіцелі сядзяць за прылаўкамі ў крамах і не спрабуюць выехаць у райёны сваёй дзейнасьці. Такое становішча, бязумоўна, адбіваецца на ўзмацненьні тэмпу загатовак.

Як справа в кантрактацыяй?

Лёзьненскае с.-гасп. крэдытнае таварыства закантрактавала валакна лёну на плошчы 520 гектараў у 549 гаспадарках. З гэтага ліку 5 гаспадарак зусім не засеялі лёну, а 102—засеялі, але няпоўнасьцю па дагавору.

Прычынамі недасеву былі: частковы недахват насеньня для пасеву і ў большай частцы тое, што пры сялянскім малазямельлі севазваротне дазволіў засеяць усю закантрактаваную плошчу.

Як мінус у працы па кантрактацыі трэба адзначыць, што гаспадары, ня выканаўшыя сваіх абавязацельстваў па пасеву лёну дагэтуль ня прыцягнуты да адказнасьці, а ў дагаворах гэта прадугледжана.

Сёлета сялянства само ўжо пачало здаваць закантрактаванае семя лёну, але з валакном яшчэ мала чуваць аб здачы. З боку сельска-гаспадарчай каапэрацыі ня прынята належных мер да збору закантрактаванага валакна.

Узмацняем загатоўкі бульбы.

Гомель, 19-10. Акрэндаль, улічваючы вельмі нязначны пэрыяд, які застаўся для загатоўкі бульбы, з прычыны надыходу халадоў, запрапанаваў усім загатоўчым арганізацыям, галоўным чынам, Райсаюзу, Гомсадсаюзу і Палессельсаюзу ўжыць рашучыя захады да ўзмацненьня загатовак бульбы, камандыраваўшы на месцы спэцыяльных людзей для ўзмацненьня загатовак.

Кожнай загатоўчай арганізацыі прапанавана выканаць вызначаны плян загатовак. Райсаюз павінен загатаваць 4345 тон бульбы, сельска-гаспадарчая каапэрацыя 10072 тоны. Прычым, для кожнага пункту і заводу вызначаны максімальныя цэны на бульбу.

Загатоўпам прапанавана сурова прытрымлівацца парадку, устаноўленага НКГандлю і чарговасьці адгрузак бульбы. У першую чаргу павінны выконвацца нарады па дастаўцы бульбы ў рабочую каапэрацыю. Палессельсаюзу прапанавана ўжыць захады да збору закантрактаванае бульбы ў найбольш кароткія тэрміны.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

Чарговае пасяджэньне СНК адбылося 18-га кастрычніка г. г. пад старшынствам Нам. Старшыні СНК тав. Карпа, С. Б. На гэтым пасяджэньні былі разгледжаны разам з іншымі наступныя пытаньні:

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ПЕРАРОСТКАЎ З ДЗІЦЯЧЫХ ДАМОЎ ПА ПРАДПРЫЁМСТВАХ І ЎСТАНОВАХ.

У сучасны момант у дзіцячых дамох налічваецца 475 перароскаў. СНК прызнаў патрэбным разьмеркаваць да 1-га студзеня 1929 году па прадпрыёмствах і ўстановах 375 перароскаў, пры гэтым па Белсельсаюзу—45 чал., па Белсельтрэсту—120 чал., па працоўных калектывах—40 чал., па саматужна-прамысловай каапэрацыі—40 чал., па ВСНГ—100 чал., па Белкаапсаюзу—30 чал. Такім чынам застаецца неразьмеркаванымі паміж прадпрыёмствамі і ўстановамі 100 перароскаў, якіх НК Асьветы павінен разьмеркаваць па сельскіх гаспадарках згодна існуючага закону. Установам, якія перадаюць перароскаў, даручана выдаць тым установам, па якіх гэтыя перароскі будуць разьмеркаваны, дапамогу з разьліку 90 руб. на кожнага перароска і забясьпечыць перароскаў вопраткай, бялізнай і абуткам, паводле норм устаноўленых для выходзячых з дзіцячых дамоў. НКФіну і акрвыканкомам даручана прадугледзець выдаткі на гэтую мэту ў каштарысах 1928—29 г.

АБ СКЛІКАНЬНІ III ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ ВУЧАСТКОВЫХ ДАКТАРОЎ.

СНК дазволіў Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя склікаць на 4-е сакавіка 1929 г. III ўсебеларускі зьезд вучастковых дактароў і працаўнікоў аховы здароўя.

УСТАНАЎЛЕНЬНЕ АБАНЭНТНАЙ ПЛАТЫ ЗА ТЭЛЕФОННЫЯ ПЕРАГАВОРЫ СЕЛЬСАВЕТАЎ.

СНК пастанавіў устанавіць на 1928-29 бюджэтны год абанэнтную плату за тэлефонныя перагаворы сельскіх саветаў у разьмеры 50 руб. за 12 хвілін перагавораў штодзённа. Упаўнаважнаму НК Пошты і тэлеграфу запрапанавана падаць у СНК дакład аб разьвіцьці тэлефоннай сеткі і аб тэлефонным абслугоўваньні ў сельскіх мясцовасьцях БССР.

АБ ПАРАДКУ ВЫЛІЧЭНЬНЯ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-КІРАЎНІЧЫХ ВЫДАТКАЎ НА 1928-29 Г. ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ, ЯКІЯ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ НА ГАСПАДАРЧЫМ РАЗРАХУНКУ.

СНК прыняў унесены НКФінансаў праект пастановы аб парадку вылічэньня адміністрацыйна - кіраўнічых выдаткаў па каштарысах на 1928-29 г. дзяржаўных органаў, якія дзейнічаюць на аснове гаспадарчага разрахунку і зьмешаных акцыйных т-ваў. Паводле гэтай пастановы, паказаныя дзяржаўныя органы павінны вылічваць асыгнаваньні на адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі выходзячы з таго, што гэтыя выдаткі, не павінны перавышаць адпаведных прызначэньняў па каштарысах на 1927-28 г. складзеных в 20 проц. скарачэньнем паказаных выдаткаў. У выпадку павышэньня аб'ёму працы супроць 1927-28 г. па прамысловых прадпрыёмствах больш, як на 17 проц. і па гандлёвых, больш, як на 20 проц., дапушчаецца павялічэньне на 1928-29 г. адпаведных каштарысных прызначэньняў супроць 1927-1928 г. складзеных з вучотам 20 проц. скарачэньня. Асыгнаваньні на адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі на такія патрэбы, якія маюць месца толькі ў 1927-28 г. і не паўтараюцца на наступны год—павінны быць выключаны пры вызначэньні разьмеру гэтых выдаткаў на 1928-29 год. Пры ўстанаўленьні разьмеру каштарысу на адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі на 1928-29 г. трэба наогул выходзіць з далейшага зьніжэньня зазначаных выдаткаў. Зьніжэньне гэта павінна быць праведзена праз рацыяналізацыю апарату, праз палепшаньне сыстэмы і мэтадаў працы, праз скарачэньне іншых выдаткаў ня зьвязаных з непасрэднымі задачамі данага органу. Праверка выкананьня гэтай пастановы ўскладаецца на НК РСІ БССР.

Што выявілі с.-г. выстаўкі.

С.-г. выстаўкі Менскай акругі ў сьвята «Дзень Ураджаю» выявілі новы клясавы элемент. Калі на с.-г. выстаўках мінулых гадоў былі экспанаты пераважна заможнай часткі вёскі, тых культурных гаспадарак, якія не адносяцца да бядняцкіх, то зараз значная частка экспанатаў на с.-г. выстаўках належыць ужо бяднейшым групам вёскі, пасялкоўцам і калгасам. Адным словам, с.-г. выстаўкі сёлетняга году зьяўляюцца жывымі сьведкамі, як за некалькі апошніх год у гушчы бяднейшага сялянства прасяклі навейшыя агрыкультурныя мерапрыёмствы, як пачынаюць распаўсюджвацца пасевы кармавых буракоў, турнэпсу, лубіну, кармавых траў і інш. інтэнсыўных культур.

Увогуле трэба адзначыць, што с.-г. выстаўкі паказалі, што ўраджай збожжавых культур сёлета значна лепшы, у параўнаньні з ураджаем мінулага году. У некаторых райёнах дакладна былі выяўлены досьледы паказальных агранамічных вучасткаў і паасобных сялян-дасьледчыкаў.

У Пухавіцкім райёне былі выстаўлены на выстаўцы гнёзды гатункоай птушкі. Гэта сьведчыць аб тым, што сялянства ўзяло курс на разьвядзеньне гатункоай птушкі, што ўсе мерапрыёмствы ўраду ў гэтай галіне сялянства чула ўспрыймае. Трэба падкрэсьліць, аднак, слабы ўдзел у выстаўках сёлетняга году савгасаў і калгасаў. Савгасы нібы ўнікаюць ад удзелу ў с.-г. выстаўках, тым часам, як вельмі пажадана прадэманстраваць на выстаўках перавагу буйнага савгаснага і калгаснага землякарыстаньня над індывідуальным. А гэтага якраз на сёлетніх выстаўках і ня было, што, бязумоўна, зьяўляецца шкодным зьявішчам.

Трэба наогул адзначыць, што арганізацыйны бок с.-г. выставак амаль усюды даволі слабы. Мясцовыя працаўнікі і грамадзкія арганізацыі, як агульнае правіла, прымалі назвычайна слабы ўдзел. У Плешчаніцкім райёне старшыня РВК нават не наведаў выстаўкі, ячэйка камсамолу таксама ня прымала ніякага ўдзелу ў арганізацыйных працах. Увесь цяжар па арганізацыі выстаўкі быў усклаўдзен выключна на агранамічны пэрсанал. У Заслаўскім райёне выстаўка была арганізавана на такім балоце, куды нельга было прыступіцца. У Койданаўскім райёне ў часе выстаўкі экспанаты пачалі пераносіць у іншае месца.

У большасьці райёну экспанаты дастаўляліся ў дзень выстаўкі, нават пасьля паўдня. Пашпарты да экспанатаў рабіліся пасьпешна, і таму экспанаты не маглі адбіваць: стан ураджаю, якасьць глебы, сацыяльны стан экспанатаў, а гэта ёсьць самае галоўнае пры дэманстраваньні экспанатаў.

Вельмі прыкрым зьявішчам трэба адзначыць на с.-г. выстаўках позны пачатак працы экспэртных камісій. Прэміі пачыналі даваць тады, калі сялянства ў большасьці пакідала выстаўкі. Зразумела, што гэта губляе эфэкт. З другога боку, мясцовая ўлада амаль нічога не рабіла, каб чым-небудзь прыцягнуць сялянства да выставак.

Да пяцігадовага пляну навукова-дасьледчай працы БССР*).

Прымаючы пад увагу, што нашы дзяржаўныя музэі злажыліся гістарычна, пераважна з мясцовых калекцый (гал. чынам з панскіх палацаў), а таксама прызнаючы законным і справядлівым імкненьне працоўных мас гараду, дзе знаходзяцца дзяржаўныя музэі, мець свой добры музэй, нельга ня лічыць: а) няматэгодным і нецатрэбным згрупаваньне калекцый усіх музэяў у адным горадзе, тым больш, што ўсе нашы гарады, дзе знаходзяцца музэі, прыблізна аднакія па насельнасьці. Культурнае значэньне Менску хоць і выдаляе яго з шэрагу іншых гарадоў, аднак згрупаваньне ў ім калекцый было-б небясьпечным у выпадку вайны, знаходжэньне-ж гэтых калекцый у другім горадзе (Магілеў) будзе затрудніць вывучэньне іх і пазбаўляць магчымасьці іх агляду шырокімі масамі працоўных; б) па тых-жа прычынах трэба прызнаць нематэгодным як падзел музэяў па вузкай спэцыяльнасьці, гэтак-жа сама і ўтварэньне цэнтральнага музэю з канцэнтрацыяй калекцый агульна-рэспубліканскага (беларускага) і агульна-сусьветнага значэньня (Менск) і астаўленьне калекцый мясцовага значэньня ў іншых музэях, бо апошняе будзе блізка раўнацца ліквідацыі гэтых музэяў; в) па колькі ў Менску і Віцебску адбываецца дыфэрэнцыяцыя музэйнага будаўніцтва, зьяўляецца нецатрэбным заснаваньне ў культ.-гістарычных музэях гэтых гарадоў ні прыродазнаўчых, ні тэхнічна-прыкладных аддзелаў; г) таксама паколькі магілеўскі музэй, дзякуючы атрыманьню ўласнага памяшканьня і з прычыны адсутнасьці ў Магілеве краязнаўчага музэю, шырока разгарнуў выбіраньне і экспазыцыю краязнаўчых калекцый, прызнаць яго ўзорным акруговым дзяржаўным краязнаўчым музэям, у сувязі з чым перагляд зедзь яго культ.-гістарычныя калекцыі ў мэтах перадачы некаторых з іх, ня зьвязаных з краем, у іншыя культурна-гістарычныя музэі; д) адсутнасьць у Гомелі акруговага краязнаўчага музэю і магчымасьць для гомельскага культ.-гістар. музэю (з магчымна-сядзібным ухілам) нашырыць сваю музэйную плошчу дапускае патрэбным паставіць пытаньне аб пераглядзе яго ў сліхійныя гады ў акруговы дзяржаўны краязнаўчы музэй з культ.-гістарычным ухілам; е) сучасныя ўзаконеныя ўзаемаадносіны дзяржаўных музэяў, як Цэнтральнага музэю (Менск) і яго аддзяленьня (іншыя гарады) па характары музэйнай працы і значэньня паасобных музэяў на практыцы не ажыцьцяўляліся, а таму ў далейшым лічыць усе 4 дзяржаўныя музэі самастойнымі, вызначаючы ў назве кожнага музэю яго характар (Віцебскі дзяржаўны культурна-гістарычны музэй, Магілеўскі дзяржаўны краязнаўчы музэй і г. д.); ж) утварыць пры Менскім музэі агульнарэспубліканскі музэйны фонд.

Што да зьместу працы дзяржаўных музэяў, то апошнія, на колькі яны зьяўляюцца навуковымі ўстановамі, бясспрэчна павінны мець і належным парадкам пастаўленую навукова-дасьлечую працу. Аднак арганізацыйная праца нашых музэяў, як маладых устаноў, і слабая кваліфікацыя музэйных працаўнікоў доўгі час перашкаджалі навукова-дасьледчаму боку працы нашых музэяў. Прызнаючы, што ў няпершы час арганізацыйную працу нашых музэяў у большасьці можна лічыць скончанай, трэба прыняць меры да ўзмацненьня нав.-дасьледчай працы музэяў, дзеля чаго неабходна: а) павысіць кваліфікацыю музэйных працаўнікоў; б) арганізаваць падгатоўку музэйных працаўнікоў шляхам асьпірантуры; в) уключыць у каштарысы музэяў выдаткі на нав.-дасьледчую працу (экспэдыцыі, нав.-камандыроўкі, навуковае выдавецтва, літаратуру); г) увязаць аддзелы Менскага музэю з адпаведнымі ўстановамі Інстытуту Беларускай Культуры.

Гаворачы аб музэйным будаўніцтве нельга не адмеціць адсутнасьці ў БССР вельмі важнага музэю прамысловасьці, аднак утварэньне яго трэба аднесьці к часу заснаваньня Інстытуту прамысловасьці, якому павінна быць і даручана арганізацыя гэтага музэю.

Што-ж датычэ краязнаўчых музэяў, то пры існуючай шырокай сетцы краязнаўчых арганізацый лік краязнаўчых музэяў нельга лічыць здавальняючым, асабліва, калі прыняць пад увагу, што музэй зьяўляецца тым асяродкам, навакол якога гуртуецца і будзе гуртавацца навукова-дасьледчая праца краязнаўчых арганізацый. У сувязі з гэтым трэба перад акруговымі і райённымі выканаўчымі камітэтамі паставіць пытаньне аб водпуску адпаведных крэдытаў на арганізацыю і ўтрыманьне музэяў. Разам з гэтым трэба адмеціць, што краязнаўчыя музэі павінны ўкамплектавацца з экспанатаў выключна мясцовага значэньня. Экспанаты агульна-рэспубліканскага значэньня і ўнікумы, якія маюцца ў краязнаўчых музэях і будуць ім знойдзены, павінны перадавацца ў дзяржаўны музэйны фонд.

АХОВА ПОМНІКАЎ ПРЫРОДЫ І МУЗЭЙНАГА ЗНАЧЭНЬНЯ.

Цесна зьвязана з музэйнай дзейнасьцю і пытаньне аб ахове помнікаў прыроды, мастацтва і старасьветчыны. У справе аховы помнікаў да апошняга году пры Інбелкульце існавала камісія для аховы помнікаў. Ею былі ўзічаны некаторыя помнікі прыроды і старасьветчыны, і ахова іх была санкцыянавана пастановай СНК. З пачатку бягучага году функцыі аховы помнікаў перададзены Галоўнавуцы, пры якой заснована дзеля гэтай мэты спэцыяльная камісія. Далейшая праца камісіі Галоўнавукі і кірунку аховы помнікаў павінна выражацца: а) у рэгістрацыі яшчэ незарэгістраваных помнікаў прыроды, мастацтва і старасьветчыны і ў абязпячэньні некаторых з іх помнікаў агульнага дзяржаўнага значэньня, якія мусяць падлягаць ахове; б) у навуковым апісаньні і вывучэньні зарэгістраваных помнікаў; в) у складаньні карты знаходжэньня помнікаў; г) у арганізацыі кажратных мерапрыёмстваў для аховы помнікаў; д) у растаўрацыі помнікаў асабліва важнага дзяржаўнага значэньня. Зразумела, што два апошнія пункты вымагаюць матар'яльных затрат, чаму трэба паставіць пытаньне аб водпуску адпаведных асыгнаваньняў, як па дзяржаўнаму каштарысу, гэтак і па мясцовому, каб такім чынам, Галоўнавука магла весьці запраўдную ахову помнікаў, а не абмяжоўвацца адной толькі іх рэгістрацыяй.

Ахова прыроды ў БССР да апошняга часу найбольш поўна была прадстаўлена ў Барысаўскім запаведніку, адным з найбольш каштоўных запаведнікаў СССР. На ўсесаюзным зьезьдзе воолёгаў у пачатку гэтага году Барысаўскі запаведнік прызнан запаведнікам усесаюзнага значэньня. І запраўды, у Барысаўскім запаведніку ёсьць жывёлы, якія зьяўляюцца рэдкімі ня толькі для Беларусі, але і для ўсёй Эўропы (бабры). Цікавы Барысаўскі запаведнік таксама і з боку сваёй фэры і з боку свайго лясного масыву, які ахоўвае Бярэзінскую водную сыстэму. Аднак, знаходжэньне запаведніка пад загадам лясного кіраўніцтва НКЗ, якое вядзе ў ім шырокую эксплёатацыю лясоў і праз гэта распуджвае жывёлу, ставіць пад пагрозу далейшае існаваньне запаведніка і ў корані перэчыць самой ідэі запаведніка. У сувязі з гэтым, а таксама прымаючы пад увагу, што ў запаведніку павінна быць арганізавана стацыянарная навукова-дасьледчая праца, зьяўляецца, канечна, патрэбным безадкладная перадача запаведніка пад загад Галоўнавукі, як гэта мае месца ў іншых саюзных рэспубліках.

Гаворачы аб запаведніках, нельга ня прыняць сваечасовым пастаноўку пытаньня аб арганізацыі належнага запаведніка, бо, бясспрэчна, Беларускае Палесье мае і агульна-сусьветнае навуковае значэньне. Месца і райён запаведніка павінны быць вывучаны ў бліжэйшыя гады.

БІБЛІЯТЭЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

Пераходзячы да разгляду бібліятэчнай справы ў яе навуковай частцы, трэба адмеціць, што тут мы маем: а) Беларускую Дзяржаўную Бібліятэку (у Менску) як цэнтральную кнігахавальню БССР б) нядаўна заснаванае яе аддзяленьне ў Віцебску і в) некалькі бібліятэк паасобных устаноў (Акадэміі Інбелкульту і інш.). У сувязі з планам бібліятэчнага будаўніцтва трэба прызнаць патрэбным заснаваньне другога аддзяленьня Дзяржаўнай бібліятэк

НА ГАСПАДАРЧЫМ ФРОНЦЕ.

Экспарт і дасьледчае садоўніцтва.

У БССР мы маем блізка каля 25000 гэктараў саду, з якіх дарослых насаджэньняў 21000 гэктар.

Сялянскае садоўніцтва ахапляе 58 проц., на савецкія, калектыўныя і інш. выпадае 42 проц.

Сялянскае садоўніцтва пашырылася стыхійна, бяз усякага пляну, таму і тэхніка досыць слабая, асартымэнт стракаты, малатаварны. Тэхнічная перапрацоўка пладоў (з сялянскіх) у віно, павідла і г. д. можа надаць таварнасьць сучаснаму сялянскаму пладоўніцтву.

Закладаньне новых масываў групавых, калектыўных сялянскіх садоў зараз імкнецца зьнішчыць па магчымасьці памылкі мінулага 50-годзьдзя.

Дасягненьні нашых садовых дасьледчых устаноў, сялян-дасьледчыкаў, шматгадовы вопыт найбольш вядомых мясцовых спэцыялістаў-садаводаў і агульная калектыўная ідэя мас стварыць вялізарны масыў новай садова-гародняй плошчы, аб якой у Заходняй Эўропе ня марыла ніводная краіна,— усё гэта заслугоўвае вялізарнай увагі.

Таварнасьць пладоўніцтва ў будучыне будзе залежыць ад сталага адбору экспартнага вельмі абмежаванага асартымэнту яблык. У гэтым напрамку вялікую надзею мы ўскладаем на цэнтральную, акруговыя і райённыя памалёгічныя камісіі. Гэты орган НКЗ трэба ўзмацніць, надаць яму аўтарытэт, друкаваць вынікі працы і хутка пашыраць вынікі паміж шырокімі колямі насельніцтва.

Значную ролю павінна адыграць экспэдыцыйнае дасьледваньне садоўніцтва БССР, якое праводзіцца Беларускім Навукова-Дасьледчым Інстытутам імя Леніна і НКЗ, папярэдняе дасьледваньне садоўніцтва паўднёвай БССР упэўніе, што ў бліжэйшыя гады магчыма будзе залажыць (прыблізна ў 6. Рэчыцкім пав. і Мазырскай акр.) вялізны масыў саду з вельмі каштоўным для экспарту абмежаваным асартымэнтам. Пакуль галоўнай крыніцай таварнай часткі пладоўніцтва зьяўляюцца савецкая, калектыўная і спэцыяльныя садова-гародныя гаспадаркі. Чарговым актуальным заданьнем зьяўляецца як мага хутчэй ужыць належныя крокі да аднаўленьня гэтых садоў. У гэтую справу трэба ўцягнуць значныя сродкі, а галоўнае, прыцягнуць высока-кваліфікаваных спэцыялістаў, якія-б трымалі шчыльную сувязь з дасьледчымі ўстановамі і ў сваёй працы карысталіся калектыўнымі вынікамі навукова-дасьледчай думкі.

Арганізацыя садова-гародных каапэрацыйных таварыстваў павінна будзе адыграць выключную ролю ў экспарце садавіны. Арганізацыя ў Менску самастойнага цэнтру «Белсадвінсаюз», які ўжо з 1929 г. павінен будзе пачаць працу на ўсю рэспубліку, зьяўляецца новай эпохай у нашым садоўніцтве.

Пажадана, каб маючыся вопыт «Плодовінсоюзу» у РСФСР і «Плодоспілкі» УССР, а таксама вопыт нашых спэцыялістаў дапамог бяз значных страт і памылак арганізаваць пладовы каапэрацыйны цэнтр у Менску.

У бліжэйшае пяцігодзьдзе прадбачыцца значнае пашырэньне тэхнічнай прапрацоўкі садавіны і гародніны: па БССР мяркуецца заснаваць каля 20 новых вялікіх заводаў у галоўных садовых раёнах. Гэта справа вельмі складаная.

Значнай перашкодай зьяўляецца адсутнасьць высококваліфікаваных аграномаў-садаводаў, якія былі-б знаёмы з сучасным становішчам гэтай справы ў СССР, а галоўнае за межамі. Неабходна арганізаваць сталую лябараторыю па тэхнічнай перапрацоўцы садавіны і гародніны пры Белдзяржакадэміі ў Горы-Горках. Падкрэслім, што без апошніх перапрыёмстваў арганізацыя заводаў будзе на напэўным грунце са значнымі стратамі і г. д.

Сувязь мерапрыёмстваў па экспарту садавіны і гародніны з дасьледчай справай павінна быць вельмі шчыльная. Неабходна пашырыць працу дасьледчага аддзелу садоўніцтва Горацкай станцыі, неабходна ў 1929 годзе адчыніць гомельскую садовую станцыю. Гаспадаркі сялян-дасьледчыкаў трэба моцна ўвязаць з дасьледчай арганізацыяй.

Зараз, напрыклад, новыя сарты яблык Я. Мароза і А. Сыцько, у сувязі з экспартам, зьяўляюцца матар'ялам выключнай каштоўнасьці.

НК Земляробства трэба зрабіць рашучыя крокі да захаваньня значных дасягненьняў садаводаў-дасьледчыкаў, да масавага распаўсюджваньня найбольш пэўных таварных пладавых сартоў.

Адкамандыраваньне за межы на доўгі тэрмін (2-х асоб штогод) садаводаў-аграномаў, скончыўшых Беларускую Дзяржаўную Сельска-Гаспадарчую Акадэмію, зьявілася-б магутным мерапрыёмствам па арганізацыі экспарту сырых пладоў, ягад, гародніны, па арганізацыі заводаў па тэхнічнай перапрацоўцы.

На шляху перабудовы гаспадарчага жыцьця, у прыватнасьці садоўніцтва, пяхай магутна ўзьнімаецца навукова-дасьледчая арганізацыя,—гэты маяк, які будзе сьвяціць працоўным на шляху іх пэўных перамог і вялікіх дасягненьняў.

Праф. М. Бурштэйн.

Трэба сваечасова застрахаваць школы і больніцы.

Гэтымі днямі на старонках нашай газэты была зьмешчана пастанова Эканомкарады БССР аб абавязковым аклаўным страхаваньні школ і больніц, якія знаходзяцца на мясцовым бюджэце.

Нельга сказаць, што школы і больніцы дагэтуль зусім не страхаваліся. У большасьці райёнаў Беларусі гэтай справе ўдзялялася параўнальна належная ўвага, але побач з райёнамі, якія страхавалі сваю маёмасьць поўнасьцю, былі і такія выпадкі, калі справе страхаваньня будынкаў школ і больніц не прыдавалі сур'ёзнага значэньня. Зараз, пасьля выданьня вышэйпаказанай пастановы, такія ненармальныя зьявішчы павінны быць зьліквідаваны.

У сучасны момант галоўная задача райвыканкомаў будзе заключацца ў тым, каб да 1 лістапада скласьці сьпісы гэтай маёмасьці і ня толькі ў адносінах будынкаў, але і ўсяго абсталяваньня. У прыватнасьці страхавацца па школах апрача будынкаў будуць інвэнтар і вучэбныя прылады, а па больніцах—таксама будынкі, інвэнтар і мэдыцынскія прылады.

Каб палегчыць працу райвыканкомаў па складаньню сьпісаў маёмасьці, праўленьне Белдзяржстраху дало распараджэньне ўсім страхавым агентам прыняць непасрэдны ўдзел у складаньні неабходных сьпісаў школьнай і больнічнай маёмасьці.

З працай па складаньню сьпісаў няма чаго цягнуць, бо правілы прадугледжваюць, што адказнасьць Дзяржстраху пачынаецца з дню адсылкі гэтых сьпісаў райвыканкомамі страхавому агенцтву.

З часу адсылкі складзеных сьпісаў адказнасьць Дзяржстраху будзе бязумоўнай. Такія чынам першы тэрмін страхаваньня будзе канчацца 30 верасьня 1929 г., а на далейшы час яно ўжо будзе прыстасоўвацца да канца бюджэтнага году,—гэта значыць з 1 кастрычніка да 1 кастрычніка наступнага году.

У чым-жа выгады абавязковага страхаваньня ў параўнаньні з дабраахвотным, якое праводзілася да гэтага гаспадарчага году?

Папершае, як мы ўжо і адзначалі, будзе страхавацца ня толькі будынак, але і рухомая маёмасьць.

Падругое—тарыфы прэмій значна зьніжаны. Так, у 1927-28 г. па дабраахвотнаму страхаваньню школ і больніц у сярэднім прыходзілася каля 50 кап. са 100 р. страхавой сумы. Зараз-жа для каменных будынкаў, якія крыты жалезам і іншымі агнятрывалымі матар'ялямі тарыф устаноўлены ў 10 кап. са 100 р., а для ўсіх іншых—па 25 кап. са 100 руб. страхавой сумы.

Райвыканкомам неабходна памятаць, што страхавыя ўзносы да 1 студзэня будуць прымацца без налічэньня пені, а пасьля гэтага тэрміну ўжо пеня будзе налічвацца.

У свой час, калі абгаварвалася пытаньне аб увядзеньні абавязковага страхаваньня школ і больніц, выказваліся думкі, што сёлета ў райвыканкомаў ня будзе на гэту мэту дастаткова сродкаў. Нам здаецца, што на практыцы гэтага не павінна быць, бо на падставе пастановы СНК БССР ад 2 красавіка 1928 г. нашы райвыканкомы павінны былі сваечасова паклапаціцца аб унясеньні ў каштарыс 1928-29 г. сродкаў у такім разьмеры, каб страхаваньнем ахапіць усю маёмасьць, якая падпарадкавана райённым выканаўчым камітэтам.

В. З—ў.

РАСЬЦЁМ І МАЦНЕЕМ.

(Савгас Сёмкава, Заслаўскага райёну).

Савгас Сёмкава арганізаваўся ў 1921 годзе. Пры арганізацыі савгас узяў у сваё карыстаньне пустыя будынкі: печы ў жылых памяшканьнях былі паламаны, інвэнтару ня было ніякага. Калектыў узяўся за працу. Пры дапамозе крэдыту, пры дапамозе савецкае ўлады пачала адбудоўвацца гаспадарка і пасьля цяжкае працы была наладжана савецкая гаспадарка. Зямлі ў гаспадарцы ворнай—156 гэктараў, сенажаці 24 гэктары, пад сядзібай 17 гэктараў. Севазварот у савгасе 9-ціпольны. Адно поле пры сядзібе засяваецца: жыта 30 гэктараў, аўса—20 гэктараў, ячменю—17 гэктараў, канюшыны—45 гэктараў, 3 поля вікі—11 гэктараў. Кораньпладоў-клубня-плодаў—14 з пал. гэктараў, лубіну—8 з пал. гэктараў. Садовы выхавальнік займае 2 гэктары, дзе вырашчваюцца ігрушы і яблыкі. Ёсьць сад, які займае 4 гэктары. Сад зда-ецца ў арэнду. Інвэнтар савгасу скла-даецца з паравой малатарні, якая ў гэтым годзе будзе рамантавацца, 2-х жняярак фірмы «Дэрэнга» і «Макорнык», 2-х касілак, 2-х дзіскавых культыватараў, 2-х сеялак (адна сеялка гароднята насеньня), спэц-сеялкі (для канюшыны), драпакоў 8 штук, 6 пар барон «Зіг-Заг», плугоў параконных 12 штук, 2-хлямешных — 2 шт., акучнікаў—4 шт., кульціватары—2 шт., маслабойкі і сэпаратары. Ёсьць 2 веялкі і дзьве сартыроўкі і малаціла з конным прыводам у 12 конскіх сіл. Ёсьць вадзяны млын, які, пры дапамозе дынама, дае ток па ўсяму савгасу. З будынкаў савецкая гаспадарка мае стайню, абору, 3 жылых памяшканьняў і 4 драўляных. Ёсьць сьвіран, будуецца склад для садавіны, паветка для інвэнтару. Маецца сталярная майстэрня з разьлікам на 20 чал., кузьня на 3 чалавекі і шавецкая майстэрня, дзе вучацца дзяўчынкі калёніі. Савгас мае 24 коняй: 20 рабочых і 4 штукі нерабочых. Кароў 29, з іх 2 быкі галяндзкай пароды, сьвіньняў 3 штукі ёркшырскай пароды, рэшта—жывёлы палепшанай пароды.

Ёсьць у савгасе дзіцячая калёнія на 150 чал. 1 сямігодка, дзе вучацца дзеці калёніі і сялянскія.

Рабочыя савгасу ўсе ліквідавалі сваю напісьменнасьць у 1926-27 г. Амаль кожны рабочы выпісвае газэту «Батрак».

Б.

ПА ШЛЯХУ ДА САЦЫЯЛІЗМУ.

(Гайна, Лагойскі р., Меншчына).

Хваля калектывізацыі, якая праходзіць зараз па ўсей нашай старонцы, захапіла таксама і маленькае мястэчка Гайна. Ня мала палажылі працы, пакуль згуртавалі мясцовых шаўцоў у арцель і пакуль здалелі ўсе супярэчнасьці. І вось хутка месяц, як у цэнтру мястэчка працуе арцель у складзе 8 шаўцоў і 2-х штэпароў пад назвай «Чырвоны Прамень».

Трэба адзначыць, што арцель мае пераспэктыву ня толькі на існаваньне, але і на пашырэньне: добрая якасьць тавару, ветлівыя адносіны працаўнікоў да заказьнікаў і параўнача невялікая цана дае арцелі вялікую колькасьць заказаў; дзень не праходзіць без 5—6 заказаў, а ў нядзельныя дні бываюць па 15—16 заказаў.

Сувязь з райённым цэнтрам таксама вельмі добрая: прыяжджаюць з Лагойску для наладжваньня рахункоўвасьці, а таксама шаўцы — спэцы для інструктажу якасьці працы.

Усе пералічаныя дадатныя бакі прадпрыёмства заклікаюць большую цягу ў арцелі шаўцоў другіх вёсак, на што кіраўніцтву арцелі трэба зьвярнуць увагу.

Т. Н.

Камуны і арцелі растуць.

(Полацак).

Па акрузе заўважаецца буйны рост розных вытворчых сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў.

За паўгода (з 1-1 па 1-7-28 г.) арганізавана тры камуны, з лікам 25 двароў, 23 арцелі, з лікам 110 двароў, тры таварыствы па супольнай апрацоўцы, з лікам 28 двароў.

Усе гэтыя арганізацыі займаюць 2326 гэктараў плошчы зямлі.

Таксама арганізавана 26 машынных таварыстваў, з лікам 308 двароў, 5 пасяўных т-ваў, з лікам 70 двароў, 10 малочных таварыстваў, з лікам 215 двароў, 12 садова-агародных таварыстваў і інш.

У камуны і арцелі ідзе больш беднята.

Т. В.

10 новых калгасаў.

(Юравіцкі р., Мазыршчына).

За гэты год лік калгасаў у райёне ўзрос з 3 да 13.

У мінулым годзе калгасы аб'ядналі толькі 27 гаспадарак, у гэтым годзе іх ужо ў калгасах 145.

Па сацыяльнаму складу значны процант беднаты, але пераважная большасьць застаецца ў серадняком.

З усіх калгасаў два ёсьць нацыянальныя, якія ўжо існуюць некалькі год.

У працы гэтых калгасаў ёсьць значныя дасягненьні ва ўсіх галінах сельскае гаспадаркі. Напрыклад, яўрэйскі калгас разводзіць добрых ёркшырскіх сьвіней, якія даходзяць па вазе да 20 п.

Вадовіцкі калектыў таксама мае значныя дасягненьні; селянін там можа шмат чаму навучыцца.

ЛЮДЗІ ЗЯМЛІ.

У ГЛУШЫ.

Уціснутае між лесу і балот—спакойна, па-абывательскі жыло мястэчка Лукомль. Да райённага цэнтру трэба адмерыць каля дваццаці кілёмэтраў, тады толькі пападзеш у мястэчка Чарэю, на чыгуначную станцыю трэба—балагол бязьлітасна „вакрое" тры рублі, бо пятнаццаціверстная дарога не адзін мае суворайскі „Чоргаў мост".

Па гнілых дошках тратуараў, бухаваных—пры «пары Гарохў», па разьлітым на вуліцах моры гразі, па тыпічнай вясковай паважнасьці і непарайлівасьці, кожны толькі сёньня трапіўшы ў Лукомль, з упэўненасьцю скажа, што гэта не райённы цэнтр.

Раніцой пастух жалейкай будзіць жыхароў, ідучы за каровамі, такімі-ж сонымі, вялымі, як і самі іх гаспадары.

Як у кожным беларускім мястэчку, тут маюцца ласкава ўхмяляючыяся тыцна гандляроў-спэкулянтаў, так званых—«акул мастэчка»: гандляроў—«кацейкіных», наперабой заклікаючых селяніна купіць пару цукерак гасьцінца дзецям і сапраўдная мястэчкавай беднаты—краўцоў, шаўцоў, кавалёў, балаголаў.

Цяжка жывецца апошняй групе людзей мястэчка, але на неадпаравозныя прапановы райвыканкому і гарачую агітацыю партячэйкі—перайсьці на зямлю, заняцца гаспадаркай, яны боязна адказвалі:

— Як-жа браткі, калі ні плуга, ні касы ня ўмеем трымаць у руках... Хай хто першы, паглядзім,—тады ўжо.

ДЗЕСЯЦЬ «РОБІНЗОНАЎ»...

Гэта сапраўды дзесяць „Робінзонаў", якія парашылі перапрысьці ад былыя арандатары, накшталт Мацюшкевіча, толькі клапаціліся аб тым, каб «дабіць да абуха» дзяржаўную гаспадарку. Сёлета млын быў перададзены камуне. Каб пусьціць млын—прышлося закупіць увесь асноўны матар'ял, што каштавала камуне каля 3000 р.

Камунары ня толькі прывялі ў парадак стары панскі сад, але і засадзілі свой.

Камуна зараз мае 10 коняй, 32 каровы дойных і 10 галоў маладняка, а таксама два заводзкія кныры.

На чацьверты год жыцьця—маладыя гаспадары навучыліся здымаць ураджай замест 50 пудоў з дзесяціны ў сялян—80-90 пудоў. Сакрэт хаваецца ў правільным і культурным вядзеньні гаспадаркі.

АКІЯН ПЕРАПЛЫЛІ.

Праз акіян непагадзь, варожасьці, праз кулі злачынцаў, перамогшы разбуранае гняздо" прыплылі камунары да цьвёрдай, надзейнай глебы.

Людзі задаволены, што кінулі „горад" і перайшлі ў някультурную, нёмную вёску. Людзі ніколі не шкадуюць былога.

Красамоўныя агітатары з «былых» не шкадуючыя ні епітэтаў, ні... языкоў, папярпелі крах. Камуна „Прышчэпава" Чарэйскага райёну, Аршанскай акругі, усёй сваёй працай, дасягненьнямі—лічбамі сухой непадкупнай статыстыкі паказалі ўсім, што і яўрэі змогуць жыць на зямлі.

Цім. Зарэчны.

У АДКАЗ НА ЗАБОЙСТВА.

Камунары ня страцілі энэргію, не разышліся на індывідуальныя гаспадаркі, як разьлічала чорная сіла вясковых падонкаў—кулакі, гандляры, людзі «з былых»,—яны яшчэ шчыльней згуртаваліся вакол адной вялікай задачы—узмацненьня агульнай гаспадаркі камуны.

За тры гады сваёй цяжкай, на першы погляд непрыкметнай працы, яны маюць шэраг буйных дасягненьняў.

Стары разбураны панскі палац канчаткова перабуставляваны і зараз, у гэтым годзе, распачата пабудова новага вялікага дому, прыстасаванага да розных камунарных патроб—кватэры, клюб, сталоўка.

Адрамантаваны і капітальна перабуставляваны ўсе іншыя будынкі.

Камуна мае вадзяны млын, але да гэтага году ён не працаваў, бо былыя арандатары, накшталт Мацюшкевіча, толькі клапаціліся аб тым, каб «дабіць да абуха» дзяржаўную гаспадарку. Сёлета млын быў перададзены камуне. Каб пусьціць млын—прышлося закупіць увесь асноўны матар'ял, што каштавала камуне каля 3000 р.

Камунары ня толькі прывялі ў парадак стары панскі сад, але і засадзілі свой.

Камуна зараз мае 10 коняй, 32 каровы дойных і 10 галоў маладняка, а таксама два заводзкія кныры.

На чацьверты год жыцьця—маладыя гаспадары навучыліся здымаць ураджай замест 50 пудоў з дзесяціны ў сялян—80-90 пудоў. Сакрэт хаваецца ў правільным і культурным вядзеньні гаспадаркі.

«ХА-ХА-ХА!.. ПЛУГ ВЫСКАЧЫЎ.

Васяньній раніцай камунары першы раз выехалі на поле. Хоць калі-ні-калі трымалі ў руках плуг, але ехалі няўпэўненыя ў тым, што з працай справяцца „чыста, гладка, хутка" як суседзіня, з дваццаціпрыцапіцаловым сельскагаспадарчым стажам, сяляне.

На гэта «дзіва дзіўнае» прыйшлі паглядзець некалькі сялян. Ухмыляючыся, прабачачы прыкмеціць нешта незвычайнае, прышлі яны на месца працы.

Першы плуг урэзаўся ў цаліну. За ім другі, трэці, чацьверты. Спачатку пайшло добра. Але вось плуг аднаго з камунараў, маладзейшага, захістаўся, «завіляў» з боку ў бок і ўрэзаўся...

— Ха-ха-ха!... Плуг выскачыў...—насьмешліва праказала некалькі галасоў.

— Нічога—навучыцеся. Каб толькі ахвота была,—навука ня мудрая...—разыходзячыся апраўдвалі свой сьмех сяляне.

Упарадкаваньне мястэчка ідзе вельмі пасьпяхова.

У часе грамадзянскае вайны мястэчка Чырвонапольле вельмі пацярпела ад пагрому. Банда лютавала дзьля суткі, пакуль не падышла чырвонаармейская частка. У часе пагрому было забіта 70 чалавек; палавіна мястэчка зьнішчана пажарам.

Гэта зруйнаваньне мястэчка было адной з прычын выклікаўшай упарадкаваньне яго ў першую чаргу.

Зараз гэта ўпарадкаваньне і адбываецца.

Першапачатковая думка аб скасаваньні бліжэйшага савгасу і аб прадастаўленьні яго зямлі жыхаром мястэчка была рашуча адхілена экрвыканкомам. Знойдзен другі зямельны фонд, у адлегласьці 5 кілёмэтраў ад мястэчка. Ён складаецца з вурочышча «Пацетуя» плошчаю ў 236 дзесяцін і ўрочышча «Кашары», плошчаю 532 дзесяціны. Акрамя таго, прырэзана 40 дзесяцін лугу цы 5 дзесяцін адведзена для птушніцкага таварыства. Усяго 813 дзесяцін.

Зараз з местачковых жыхароў утвораны 4 сельска-гаспадарчыя арцелі, у якія ўвайшло 63 сям'і. Трэба адзначыць, што спачатку ня было жадаючых пераходзіць на земляробчую працу так далёка ад мястэчка.

Вельмі падняў настрой новых калгасаўцаў і наогул местачковых жыхароў возпуск савнаркомам 2000 рублёў на гаспадарчае асваеньне адшуканага зямельнага фонду. Усе адчулі, што аб іх думаюць і даюць канкрэтную дапамогу.

Арцелі ня толькі афармлены, але ўжо і прыступілі да гаспадарчае працы. 2 арцелі апрацавалі і засеялі 25 дзесяцін жытам па мінэральным угнаеньні. Гэты засеў трэба прызнаць першым значным посьпехам.

Першы засеў праходзіў пры вельмі цяжкіх умовах (але ўсё-ж ён зроблен!).

У арцельшчыкаў было ўсяго 6 коняй і амаль ніякага інвэнтару. Самі яны з сем'ямі сядзелі галодныя, і жонкі спрачаліся супроць працы на новых мясцох і ўгаварвалі мужоў лепей ісьці на вёску, каб зарабіць на кавалак хлеба.

Тут якраз прышоў на дапамогу фонд Савнаркому; з яго былі выдадзены авансы. Было набыта 5 коняй, закуплены пры дапамозе крэдыту плугі, савгас Елізавеціна даў насеньне.

У будучыне, зразумела, трэба яшчэ прарабіць значную працу па замацаваньні ўтвораных арцеляў, сыстэматычным іх абслугоўваньні, па гаспадарчым асваеньні падлесных і высечаных плошчаў, па пабудове будынкаў.

Значную гаспадарчую ролю зможа адыграць мяркуемы да пабудовы на арцельных пачатках мэханізаваны завод для апрацоўкі малака ў савгасе Елізавеціна, які будзе абслугоўваць арцелі, савгас і насельніцтва мястэчка.

Акрамя ўпарадкаваньня мястэчка па лініі сельска-гаспадарчай, ідзе ўтварэньне саматужна-рамесьніцкіх арцеляў.

К—к.

Магілеўшчына.

БЕДНАТА ПЕРАМОЖА.

За 12 вёрст ад райённага цэнтру, паміж балотамі, на ўзгорку, раскінулася вёска Верхмень.

Верхмень мае за сабой гісторыю. Быў час, калі вёска была валасным цэнтрам.

Зараз замест валаснога праўленьня, на памяшканьні красуюцца шыльды; Верхменская хата-чытальня.

Верхменскі сельскі савет, Смалявіцкага райёну.

Замест грознага-барадача, кулака-старшыні воласьці, бадняк—старшыня сельскага савету.

Гады і людзі зрабілі зьмену.

Вялікую зьмену.

Верхменскія земляробы не аднойчы праклінялі сваю долю, вязучы воз гною, ці едучы араць і сеяць за некалькі вёрст на свой шнур-палоску.

Але вось партыя выкінула лёзунг—беднота, ідзі ў калектывы—перабудоўвай сельскую гаспадарку на новы лад.

І тады ў хаце-чытальні па вячарох пазьней пачаў гарэць агонь і пазьней сядзелі вясковыя актывісты з сэкратаром партыйнай ячэйкі—так. Хацкевічам і гутарылі...

Гутарылі аб тым, як зрабіць сельска-гаспадарчы калектыў.

І, нарэшце вырашылі. Сабраліся на сходку і калі пачалі казаць аб калектыве, усе прысутныя заявілі: «даёш земляўпарадкаваньне ўсяе вёскі".

На гэтым, парашыўшы, разышліся.

Пачалося земляўпарадкаваньне. У заможнікаў Салодкага, Ашманкевіча, Цьвіліка і Федаровіча гаспадаркі падлягаюць абрэзцы.

Бачачы, што зямлёй ад абрэзак будуць карыстацца другія, гэтая кампанія піша заяву ў ЦВК Беларусі і падае не, указаўшы, што земляўпарадкаваньне праводзіцца няправільна, аб тым, што вёска земляўпарадкоўвацца ня хоча, аб чым могуць сьведчыць подпісы грамадзян. ЦВК пераслаў гэту заяву ў Менакрэз, а апошняе з прапановай утварыць расьсьледваньне—Смалявіцкай РЗК.

Загадчык земаддзелу выехаў у Верхмень і высьветліў, што подпісы на заяве падложныя, і склаў за падлог акт на Салодкага і другіх.

Бачачы, што гэты нумар „на ўдаўся", заможнікі адмовіліся даваць рабочую сілу. Прышлося нанаць рабочых за лік заможнікаў, бо затрымоўваць земляўпарадкаваньне з-за 4-5 чалавек немагчыма. І гэты «нозыр» заможнікаў быў біты.

Тады яны пішуць заяву, у якой чорным па беламу напісана: «мы адмаўляемся ад земляўпарадкаваньня, бо яно нам непатрэбна».

З заявай ідуць па хатах і кажуць, «ты хочаш застацца на месцы»?

І атрымаўшы адказ „хачу" дадавалі—падпішыся пад заявай. Той падпісваўся.

Калі хто-небудзь з беднаты адмаўляўся падпісаць, то яму казалі: «падпішыся, лепей будзе, бо іначай .. заб'ём, ці спалім". Так рознымі спосабамі вырывалі подпісы тэрарызуючы насельніцтва.

Гэтыя махінацыі выкрываюцца і складаецца акт, які накіроўваецца ў райвыканком. Райвыканком замест таго, каб прыняць належныя меры, аградзіць беднату ад тэрарыстычных дзеяньняў і пагроз, павольна, не клапоцячыся, займаўся... штодзённай работай, не зварачаючы належнай увагі на земляўпарадкаваньне.

Нарэшце зьбіраецца сход. Стаіць пытаньне аб земляўпарадкаваньні. Бядняцка Малінаўская выступіла і сказала, што земляўпарадкаваньне патрэбна. З усіх куткоў на яе зашыкалі заможнікі і іх прыхвасьні з пагрозай «маўчы, бо з-за вугла»...

Камэнтарый да гэтага ня трэба. Гэта яркі факт тэрарызаваньня беднаты.

А ячэйка КП(б)Б працуе над тым, каб скалаціць моцны калектыў. Заможнікі сьмяюцца, кажучы: «што вы зробіце, калі ўсе ня хочуць земляўпарадкаваньня».

І праўда. У час разгляду пытаньня аб высяленьні на пасёлкі, камісія вынесла пастанову аб перасяленьні некаторых бедняноў.

Заможнікі скарысталі гэты факт па свойму.

— Яны (партыя і савецкая ўлада) хочуць абы толькі правесьці земляўпарадкаваньне, а як жыць будзеш,—гэта ня іх справа...

«Вутка» ўдалася. Беднота выказалася супроць земляўпарадкаваньня. Салодкі і К° падняслі галовы вышэй. (Іх узяло).

Але не надоўга, бо к гэтаму часу ўжо арганізавана: і сельска-гаспадарчы калектыў і 2 арцелі па грамадзкай запашцы зямлі.

Амаль уся беднота ахоплена калектывам і арцелямі.

Засеў азімага кліну вытвараны калектывам і арцелямі разам.

Гэта ўжо адно кажа за тое, што махінацыі заможнікаў пацярпелі крах.

Але ёсьць небясьпека, што земляўпарадкаваньне сёлета на скончыцца.

Што будзе весной?—Вось думка якая пануе ў галаве Верхменскага земляроба. Ня гуляць-жа ў „калі".

У дэзарганізацыі па справе земляўпарадкаваньня многа прымаў удзел мясцовы поп—Бляхеў, дзячыха Мазура, ды вагара папа—Шаркоўскі, які працуе ў Менскім Акрэз.

Справай земляўпарадкаваньня ў в. Верхмені павінны заняцца ня толькі зямельныя органы, але сьледчыя і судовыя, бо ў часе земляўпарадкаваньня быў дапушчаны тэрор з боку кулацтва.

С. НОРТМАН.

Смалявічы, Меншчына.

КРЭДЫТАВАНЬНЕ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ Ў 1928-1929 ГОДЗЕ*).

САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАЯ ЎСТАНОЎКА ПЛЯНУ.

Па сацыяльных групаваньнях крэдыты па пляну Белсельбанку ў 1928-29 г. разьмяркоўваюцца так:

	Сума	Удзельная вага.	Рост супроць 1927-1928 году.
1. ПА АБАГУЛЕНАМУ СЭКТАРУ.	14978 т. р.	55,0	+ 76,7
У тым ліку:			
а) савгасам	3867 „ „	14,3	+ 30,2
б) калгасам	4588 „ „	17,4	+145,8
в) спэц. вытворчым т-вам сел-гас. каапэрацыі.	4760 „ „	17,4	+ 88,9
г) прамысловым арцелям	440 „ „	1,7	+ 51,7
д) дзяржаўным і камунальн. прадпрыём. с-г. значэньня	1096 „ „	4,1	+ 92,3
е) камітэтам т-ваў сялянскай узаемадапамогі	227 „ „	0,9	—
2. ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЯЛЯНСКІМ ГАСПАДАРКАМ.	11802 „ „	44,2	+ 34.4
у тым ліку выключна бяднякам	5978 „ „	51,4	

Найбольшая сума крэдытаў па абагуленаму сэктару накіроўваецца на ўзмацненьне савецкіх і калектыўных гаспадарак (31,7 проц. пляну). Для гэтых арганізацый вызначаецца крэдытных укладаньняў 7,9 міл. руб. супроць 4,7 міл. руб. па пляну бягучага году. Затым прадбачыцца амальшто дастатковае забесьпячэньне крэдытам спэцыяльных відаў с.-г. каапэрацыі (17,4 проц. пляну). Сярод іх найбольшы разьмер выпадае на долю малочна-жывёлаводнай каапэрацыі. Для здавальненьня патрэб малочнай каапэрацыі вызначана 1.272 тыс. руб. Па мэліарацыйнай каапэрацыі прадбачыцца накіраваць 1.267 тыс. руб. Затым машына-насеннаводным т-вам прадназначана 461 тыс. руб., садова-гародным т-вам—270 тыс. руб. і іншым—1500 тыс. руб.

Па прамысловых арцелях найбольшы разьмер крэдытаў выпадае на долю смолярных арцеляў—110 тыс. р. Таксама досыць значныя сумы вызначаны на арганізацыю ткацкіх арцеляў і арцеляў па валяльнаму промыслу.

З крэдытаў, вызначаных для дзяржаўных і камунальных прадпрыёмстваў с.-г. значэньня, найбольшая частка (470 тыс. руб.) прыпадае на прадпрыёмствы Дзяржгандлю па перапрацоўцы с.-г. прадуктаў для патрэб экспарту. Некаторая сума крэдытаў (200 тыс. руб.) вызначаецца для пабудовы с.-г. прадпрыёмстваў (цэнтральнай малочнай, фруктовага і крахмальнага заводаў) па лініі мясцовых трэстаў. Па прыкладу мінулага году вызначаецца частка крэдытаў (125 тыс. руб.) для райвыканкомаў для пабудовы сельскіх электрастанцый. Рэшта крэдытаў на гэтай групе падае на долю с.-г. фэрм пры вопытна дасьледчых станцыях, вучэбных установах і на працоўна-выхаваўчыя сельска-гаспадарчыя калёніі.

Больш плянава, чымся гэта мела месца ў мінулым годзе, мяркуецца сёлета забясьпечыць крэдытам таварыствы сялянскай узаемадапамогі па арганізацыі пракатных і рамонтных пунктаў, па рамонту млынаў і інш.

Паасобныя сялянскія гаспадаркі ў 1928-29 годзе будуць здаволены крэдытам у суме 11,8 міл. руб. супроць 8,6 млн. р. па пляну 1927-28 г. З гэтай сумы 5.978 тыс. руб. вызначаецца выключна для бяднацкіх сялянскіх гаспадарак, што складае 51,4 проц. усіх крэдытных сродкаў, якія мяркуецца ў 1928-29 г. выдаць паасобным сялянскім гаспадаркам. Для гэтай групы гаспадарак вызначаны амаль што выключна доўгатэрміновыя крэдыты, якія будуць выдавацца на набыцьцё коняй, кароў, сельска-гаспадарчых машын, мінэральнага ўгнаеньня, насеньне і толькі частка крэдытаў на кантрактацыю будзе кароткатэрміновых.

Частка сродкаў будзе выдадзена бяднацкім гаспадаркам на асобна-ільготных умовах па спэцыяльнаму фонду для беднаты з 2 з паловаю проц., а частка агульных сродкаў сыстэмы с.-г. крэдыту—з 4 проц. замест 6 проц., якія браліся з іх дагэтуль.

Адсюль можна бачыць, што сацыяльна-эканамічная ўстаноўка крэдытнага пляну сыстэмы с.-г. крэдыту БССР цалкам адпавядае жыцьцёвым патрэбам сельскай гаспадаркі БССР і дадзеным сыстэме с.-г. крэдыту дырэктывам ураду па развіцьцю сельскай гаспадаркі.

ФІНАНСАВЫЯ ПЭРСПЭКТЫВЫ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПЛЯНУ.

Для пакрыцьця вызначанага разьмеру крэдытаваньня сельскай гаспадаркі ў 1928-29 годзе мяркуецца адшукаць сродкі з наступных крыніц:

	СУМА	Удзельная вага	Узрост супроць пляну 1927-28 г.
А. ПА АГУЛЬНЫХ СРОДКАХ.			
1. Зварот з пазычак часткі асноўных капіталаў Белсельбанку і Акрсельбанкаў	1744 т.р.	6,4	— 7,0 %
2. Новыя папаўненьні асноўных капіталаў Белсельбанку і Акрсельбанкаў.	2870 т.р.	10,6	+ 79,2 %
3. Сродкі сел.-гасп. крэд. Т-ваў	1200 т.р.	4,6	+ 200,0 %
4. Крэдыты Цэнтрасельбанку	15411 т.р.	57,9	+ 82,4 %
Б. ПА СПЭЦЫЯЛЬН. СРОДКАХ.			
5. Зварот з пазычак у спэцыяльныя фонды	485 т.р.	20,6	+ 64,2 %
6. Новыя асыгнаваньні ў спэцыяльныя фонды з дзяржбюджэту 1928-29 г.	5070 т.р.		
РАЗАМ	26780 т.р.	100	+ 64,8

Зьмяншэньне разьмеру паступленьняў па пазычках супроць 1927-28 году тлумачыцца тым, што ўстановы сел.-гасп. крэдыту, пачынаючы з 1926-27 г., разьвілі шпаркі тэмп пашырэньня доўгатэрміновых укладаньняў за рахунак сваіх капіталаў. Зараз з асноўнага капіталу Белсельбанку накіроўваецца на доўгатэрміновае крэдытаваньне 90 проц, а з капіталаў Акрсельбанкаў—75 проц. Зразумела, што гэтае зьявішча павінна адбіцца на хуткасьці звароту.

З новых папаўненьняў асноўных капіталаў Белсельбанку і Акрсельбанкаў 2650 тыс. руб. выпадае на долю асыгнаваньняў з дзяржаўнага і

У Цэнтральнай Выбарчай Камісіі

ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБОРЧАЙ КАМІСІІ.

Пленум Цэнтральнай Выбарчай Камісіі пастанавіў склікаць у хуткім часе пашыраны пленум Цэнтральнай Выбарчай Камісіі супольна з шырокім прадстаўніцтвам усіх цэнтральных ведамстваў і грамадзкіх арганізацый і з удзелам прадстаўнікоў акруговых выбарчых камісій.

Пашыраны Пленум Цэнтральнай Выбарчай Камісіі абмяркуе цэлы шэраг пытаньняў, завязаных з перавыбарамі саветаў.

ПРЭЗЫДЫУМ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ.

Пленум Цэнтральнай Выбарчай Камісіі абраў прэзыдыум, у склад якога ўваходзяць: т.т. Хацкевіч, Гантман, Рыжоў, Файнбург, Крэмер, Крахмець і Галавач, Прэзыдыум будзе разбіраць больш дробныя справы, у прыватнасьці разгляд заяў па аднаўленьні ў выбарчых правах.

Пленум Менскага АВК

ДА ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ.

Аб надыходзячых перавыбарах саветаў у Менскай акрузе врабіў даклад старшыня Менскага АВК т. Яцкевіч.

Прамоўца зазначыў, што сёлетняй кампаніі перавыбараў саветаў надаецца вялізарнае значэньне, бо яна будзе праходзіць у той час, калі БССР знаходзіцца на шляху шырокага сацыялістычнага будаўніцтва, індустрыялізацыі народнай гаспадаркі, калектывізацыі вёскі, пашырэньня культуры, барацьбы з бюракратызмам і абастрэньня клясавай барацьбы на вёсцы.

Наступаючая перавыбарчая кампанія павінна прайсьці як генэральная праверка правільнага вырашэньня чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Сёлетнія перавыбары павінны папулярызаваць асноўныя задачы нашага далейшага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Перавыбары павінны забясьпечыць: пасьпяховае ажыцьцяўленьне і правільнае вырашэньне гэтых задач у дзейнасьці новых саветаў і выканкомаў; уплыў на разьвіцьцё мясцовай прамысловасьці, гаспадаркі і культурнага будаўніцтва; вылучэньне найбольш актыўных, клясава-вытрыманых і працаздольных пралетарыяў на кіраўнічную савецкую працу і інш.

Новая перавыбарчая кампанія павінна прайсьці пры поўным вучоце ўсіх ненармальных бакоў мінулае кампаніі. Асноўнымі-ж недахватамі мінулае перавыбарчае кампаніі былі: памяншэньне колькасьці удзелу выбаршчыкаў па акрузе на 1,38 проц.,—у параўнаньні з 1926 годам і памяншэньне ліку жанчын у выбарчым складзе саветаў на 1,5 проц., і слабое ўцягненьне ў перавыбарчую кампанію с.-гаспадарчых рабочых, батрацтва, бедноты і інш.

Зварочваючы на гэта ўвагу Гарсаветаў і РВК, пленум Менскага Акрвыканкому прапануе безадкладна разгарнуць працу па азнаямленьні шырокіх працоўных мас з асноўнымі задачамі чарговых перавыбараў і задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Склесці, на падставе распараджэньня прэзыдыуму ЦВК, пры прэзыдыумах АВК і РВК спэцыяльныя камісіі, якія павінны правяраць, ці нізавыя саветы, выканкомы і іх камісіі выконвалі наказы выбаршчыкаў і дырэктывы вышэйшых саветаў.

Асаблівую ўвагу зьвярнуць на мерапрыёмствы па забясьпечаньні далейшага росту палітычнай актыўнасьці і ролі ў выбарчых савецкіх органах жанчын работніц і сялянак.

РАСПАЎСЮДЖАНЬНЕ 2-Й ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

З дакладу загадчыка Акрфа т. Танхілеўскага аб распаўсюджваньні ў Менскай акрузе 2-й пазыкі індустрыялізацыі відаць, што гэтае пытаньне прайшло ў акрузе зусім здавальняюча.

На 1-га кастрычніка 2-я пазыкі індустрыялізацыі па г. Менску і Барысаву рэалізавана на суму 1.765.310 руб., што складае 176,5 проц. заданьня, на райёнах—332.490 руб., ці 166 проц. заданьня. Усяго на Менскай акрузе рэалізавана 2.292.430 р. ці 169,8 проц. заданьня.

Праца па распаўсюджваньні пазыкі сярод сялянства на вёсцы, за выключэньнем Койданаўскага райёну, дзе рэалізавана 83,2 проц. Сьмілавіцкага—61,2 проц. і Самахвалавіцкага—58,1 проц.,—яшчэ разгорнута слаба.

Дрэнна праведзена праца па рэалізацыі пазыкі і сярод членаў наступных прафсаюзаў: працасьветы, мэдсанпрацы, краўцоў, парсувязі, друкароў і харчавікоў.

С. Азерскі.

БЕЛАРУСКАЯ СЯЛЯНСКАЯ ТКАНІНА НА ЗАМЕЖНЫЯ РЫНКІ.

Беларуская сялянская тканіна пачынае знаходзіць сабе спажыўца ня толькі на ўнутраным рынку, дзе адчуваецца вялікі попыт на саматканыя абрусы, паясы, рушнікі, прасьцірадлы, дываны ды інш., але нават замежны рынак надта цікавіцца гэтымі рэчамі.

Дзеля таго, каб даць належнае разьвіцьцё саматужнаму ткацтву, Беларускі Саматужны Прамысловы Саюз ужыў цэлы шэраг мерапрыёмстваў у справе арганізацыі саматужных арцеляў, падбору інструктароў, забесьпячэньня гатовай пражай і вышуканьня адпаведных красён і бёрдаў. Да гэтага часу ўжо арганізаваны 7 арцеляй. Лошніцкая арцель Барысаўскага райёну, Халіпінская, Аршанскае акр. і Палыкавіцкая Магілеўскае акр. разьвіваны выключна на ткацтва высока-мастацкіх тканін для экспарту. Два спэцыялісты-інструктары назіраюць і кіраюць работай. Зроблены ўжо адпаведныя ткацкія станкі і выпісаны з Масквы шырокія бёрды. У канцы кастрычніка мае паступіць экспартная прадукцыя з гэтых арцеляў. У 1928-29 г. мае быць вывезена за межы на 30.000 руб. розных прадметаў сялянскага ткацтва. Галоўнымі месцамі збыту зьяўляюцца: Паўночныя Амэрыканскія Злучаныя Штаты, Аргентына, Мексыка, Францыя, Нямеччына ды інш. краіны.

Поруч з гэтым арганізуюцца арцелі па ткацтву сялянскіх паясоў, якія ў некаторых мясцох БССР ткуцца вельмі прыгожа з мастацка выкананымі вузорамі. Такія арцелі будуць арганізаваны ў Горках, Капылі і ў Менску. Прымаючы пад увагу, што розныя рэчы вышываньня маюць у нас вялікі попыт, будзе арганізавана арцель па вышываньню абрусоў, дарожак, кашуль і інш. рэчаў. Пад вясну мае быць шырока разгорнута вышываньне кашуль.

Робяцца спробы да адшуканьня майстроў па ткацтву дываноў. Гэта справа даволі складаная, бо майстры, ці праўдзівей сялянкі-ткачыхі, расьцярушаны і іх з арганізацыйнага боку цяжка сабраць. Аднак, мы лічым, што ў гэтай галіне пакуль што мала робіцца, тым часам, як ткацтва дываноў павінна быць пастаўлена ў нас на прамысловы грунт. Толькі трэба падшукаць адпаведных ткачых, праінструктаваць і забясьпечыць іх гатовай пражай.

Арыгінальнай групай рамесьнікаў зьяўляюцца на Беларусі т. з. багамавы, якія жывуць каля Веткі, Гомельскай акр. У дарэвалюцыйныя часы яны займаліся маляваньнем абразоў. Зараз робяцца спробы выкарыстаць гэты від рамесьнікаў на іншую працу, напрыклад, распісваньне розных рэчаў з пап'е-машэ, дрэва беларускімі нацыянальнымі малюнкамі.

Зусім слушна, што ўсе гэтыя мерапрыёмствы патрабуюць шмат клопату і настойлівасьці, але мы не павінны забываць, што ў гэтай галіне ў нас не пачаты край, шмат грошай можна даць зарабіць нашаму сялянству і экспартаваць заграніцу значную прадукцыю саматужных вырабаў.

У гэтых адносінах нам трэба вучыцца ад украінцаў, якія ўжо даўно належна наладзілі гэту справу. На Украіне ня толькі існуе шмат розных ткацкіх арцеляй па ткацтву і па вышываньню, але нават існуюць спэцыяльныя курсы і спэцыяльная школа па падрыхтоўцы працаўнікоў належнай кваліфікацыі.

У БССР ёсьць усе магчымасьці для шырокага разьвіцьця і належнай пастаноўкі саматужнага сялянскага ткацтва.

К. І.

ХРОНІКА.

Будынак для Беларускай Акадэміі Навук

Яшчэ да перайменаваньня ІБК у Беларускую Акадэмію Навук праэктавалася пабудова спэцыяльнага будынку для ІБК в 3-х корпусаў в агульным плацам у 24.791 кв. мэтр. Паводле праэкту мяркуецца пабудова галоўнага корпусу для зьмяшчэньня кіраўніцтва Акадэміі Навук, тых навукова-дасьледчых устаноў, праца ў якіх носіць габінэтны характар нацыянальных сэкцыяў, бібліятэкі, друкарні і іншых пры кіраўніцтве Акадэміі Навук, устаноў. Другі корпус лябараторнага тыпу прызначаецца для зьмяшчэньня ўстаноў, якія ў сваёй навукова-дасьледчай працы зьвязаны з працаю ў лябараторыях. Трэці музэйны корпус—для тых навуковых устаноў, праца якіх будуецца на здабытых матар'ялах.

Агульны кошт пабудовы гэтых 3-х корпусаў з належным абсталяваньнем па каштарысу вызначаны ў разьмеры 2.508.000 руб.

Спрэчным зьяўляецца пытаньне адносна існаваньня пры Акадэміі Навук бібліятэкі, бо ў мэтах аб'яднаньня сродкаў паўстае пытаньне аб утварэньні ў Менску аднэй Цэнтральнай бібліятэкі, якая-б абслугоўвала патрэбы навучальных і навукова-дасьледчых устаноў, для непасрэдных-жа патрэб Акадэміі Навук неабходна пры габінэтах яе ўстаноў утварыць бібліятэкі вузка спэцыяльнага характару.

Менскі дзень.

— Управа Дзяржгандлю БССР заказала ў Нямеччыне на 140.000 часьці каталоў і іншых машын для Асінэстрою.

— У бліжэйшы час галоўная каса ашчадкасьці БССР адчыніць, у выглядзе вопыту сельскую касу ашчадкасьці ў Менскай акрузе. Гэту каса ашчадкасьці мяркуецца адчыніць у м-ку Грозава, альбо Гроску.

— Кампанія па перавыбарах нізавых ячэек (мясцкомаў і фабкомаў) саюзу друкароў адкладзена, у сувязі з калдагаворнай кампаніяй, да лютага м-ца.

— Менскі камбінат заказаў у Аўстрыі, праз Управу Дзяржгандлю БССР, розныя машыны для падстанцыі менскага трамваю.

— 12 рабочых—сяброў саюзу мэталістаў—былі сёлета прэміраваны за розныя вынаходкі ад 15 да 100 руб.

— Акруговая канфэрэнцыя камсамолу ЦК ЛКСМБ пастанавіў правесьці пасьля правядзеньня перавыбарчай кампаніі. Тэрмін скліканьня канфэрэнцыі арыентровачна вызначан на сакавік 1929 г.

Цэнтральнае бюро пралетстуду зараз распрацоўвае пытаньне аб выданьні ў БССР штотыднёвай студэнцкай газэты.

— 70.000 плугоў вытворчасьці беларускіх мэталічных заводаў рэалізавана Беларускім мэталётрэстам у працягу 1927-28 году.

— Сёньня адчыняецца клюб друкароў. Для беспрацоўных сяброў саюзу чытальня клюбу будзе адчынена зранку.

— Пленум ЦК Мопру БССР адчыняецца сёньня, 20-га кастрычніка, у клюбе імя Леніна. На пленуме будзе абгаворан шэраг пытаньняў, зьвязаных з далейшай працай Мопру БССР. У працы пленуму прымуць удзел прадстаўнікі ад усіх акруг.

— Памятку «У дапамогу ячэйкам» выдае ЦК ЛКСМБ да перавыбараў саветаў. Памятка ачачае ўсе пытаньні, якія датычацца да перавыбараў саветаў і будзе разасланa ўсім ячэйкам.

— У Менску адчыніўся ўсебеларускі зьезд мэталістаў. У працы зьезду прымаюць удзел калі 150 делегатаў. На зьезьдзе будзе заслухан даклад Беларкомэталётрэсту аб перспактывах на бягучы год.

Да сьвяткаваньня 10-годзьдзя БССР.

Наркамасьветы даў указаньне ўсім дзяржаўным тэатрам і Белдзяржкіно падрыхтаваць пастаноўкі, прысьвечаныя 10-годзьдзю існаваньня БССР. Побач з гэтым дадзена ўказаньне Дзяржаўнаму музэю і яго аддзяленьням у Гомелі, Віцебску і Магілеве, а таксама і дзяржаўнай бібліятэцы зрабіць выстаўкі дакумантаў і літаратуры, прысьвечаныя 10-годзьдзю існаваньня БССР.

Падрыхтоўка да кастрычнікавых урачыстасьцяй.

ЦБ пралетстуду распрацавала плян удзелу студэнцтва ў сьвяткаваньні 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. У час сьвяткаваньня намечана правесьці шэраг вечароў па ВНУ і тэхнікумаў сумесна з падшэфнымі вайсковымі часьцямі.

Усім навучальным установам запрапанована тэрмінова арганізаваць спэцыяльныя камісіі.

Сьвяткаваньне студэнцтва будзе праходзіць пад лёзунгамі барацьбы за культуру, за здаровы быт і за павышэньне акадэмічнай пасьпяховасьці.

Удзел студэнцтва ў культпаходзе камсамолу.

Студэнцтва такоама прымае ўдзел у культпаходзе камсамолу.

ЦБ пралетстуду пастанавіла выдзеліць ня менш 500 студэнтаў для вядзеньня працы на ліквідацыі непісьменнасьці. Пастаноўлена таксама правесьці працу студэнтаў на ліквпунктах.

Студэнты будуць прымаць удзел у правядзеньні камсамольскімі ячэйкамі розных мерапрыёмстваў у грамадзкай працы.

Запрашэньне Беларускага Дзяржаўнага Вандроўнага Тэатру ў Ленінград.

Нар. Кам. Асьветы БССР атрымаў адносіну ад Беларускага Дому Асьветы ў Ленінградзе з просьбай аб накіраваньні Беларускага Дзяржаўнага Вандроўнага тэатру прд кіраўніцтвам Галубка ў Ленінград для пастановак у Беларускім Доме Асьветы, а таксама на Абухаўскім і Пуцілаўскім заводах.

Трупа мяркуе выехаць у Ленінград у першых лічбах сьнежня м-ца.

Паступленьне сельска-гаспадарчага падатку.

На 16-га кастрычніка па БССР паступіла сельска-гаспадарчага падатку 3.304.000 руб., што складае 23,9 проц. сумы сельскага гаспадарчага падатку за вылікам усіх зробленых да гэтага часу скідак і ільгот.

Па паасобных акругах найлепшыя вынікі па ўзносу сельскагаспадатку далі Мазырская, Бабруйская і Магілеўская акругі.

На апошнім месцы стаяць Віцебская і Гомельская акругі.

Тэрмін другой раты па ўзносу сельска-гаспадарчага падатку канчаецца 15-га сьнежня г. г. і пагэтаму РВК і сельсаветы павінны прыняць усе меры да своечасовага выкананьня падатку.

Да ўсебеларускага зьезду савецка-гандлёвых служачых.

Сёньня, 20 кастрычніка, адчыняецца ўсебеларускі зьезд саюзу савецкіх і гандлёвых служачых, якому належыць вырашыць шэраг важных і сурёзных пытаньняў.

Саюзная маса ў апошні час (на справаздачных сходах Цэнтральнага Праўленьня саюзу) адзначыла цэлы шэраг ненармальнасьцяў у галіне абарончай працы, у галіне ўзьяднаньня актыўнасьці членскае масы.

Культпраца яшчэ стаіць далёка не на вышыні, саюзны клюб ня ўсіх задавальняе.

Зьезду прыдзецца паставіць пытаньне аб грунтоўнай лоніцы ў працы, неабходна стварыць такія ўмовы, пры якіх членская маса сапраўды магла бачыць у асобе саюзу абарону. Ня ўобра стаіць справа на сяле, в прапаўнікамі сельсаветаў, РВК, якія працуюць «ад золаку да золаку», пры нікчэмнай аплаце працы. Зьезду прыдзецца зьвярнуць асаблівую ўвагу на гэтыя хваравітыя пытаньні.

З другога боку, у зьвязку з набліжэньнем калдагаворнай кампаніі, зьезду прыдзецца сказаць сваё слова, што ня ўсе органы выконвалі калдагаворы—было вельмі шмат канфліктаў.

Зьезд будзе працаваць 4-5 дзён і трэба лічыць, што яму ўдасца знайсьці агульную мову в масай.

На самалёт „Школьнік".

Наркамасьветы сумесна з ЦС ТДА-Авіяхіму вырашыў правесьці кампанію па збору сродкаў на пабудову вучобнага самалёту „Школьнік".

Кампанія працягнецца в 20 кастрычніка да 20 лістапада і будзе праводзіцца на школах сацвыхову, прафшколах, тэхнікумах і рабфаках. Уся кампанія будзе праводзіцца пад лёзунгам узмацненьня абароны СССР праз арганізацыю ТДА-Авіяхіму і пашырэньня шэрагаў апошняга.

Дадзеньне сяльскагаспадарчага падатку.

На 16-га кастрычніка па БССР паступіла сельска-гаспадарчага падатку 3.304.000 руб., што складае 23,9 проц. сумы сельскага гаспадарчага падатку за вылікам усіх зробленых да гэтага часу скідак і ільгот.

Па паасобных акругах найлепшыя вынікі па ўзносу сельскагаспадатку далі Мазырская, Бабруйская і Магілеўская акругі.

На апошнім месцы стаяць Віцебская і Гомельская акругі.

Тэрмін другой раты па ўзносу сельска-гаспадарчага падатку канчаецца 15-га сьнежня г. г. і пагэтаму РВК і сельсаветы павінны прыняць усе меры да своечасовага выкананьня падатку.

Да ўсебеларускага зьезду савецка-гандлёвых служачых.

Сёньня, 20 кастрычніка, адчыняецца ўсебеларускі зьезд саюзу савецкіх і гандлёвых служачых, якому належыць вырашыць шэраг важных і сурёзных пытаньняў.

Саюзная маса ў апошні час (на справаздачных сходах Цэнтральнага Праўленьня саюзу) адзначыла цэлы шэраг ненармальнасьцяў у галіне абарончай працы, у галіне ўзьяднаньня актыўнасьці членскае масы.

Культпраца яшчэ стаіць далёка не на вышыні, саюзны клюб ня ўсіх задавальняе.

Зьезду прыдзецца паставіць пытаньне аб грунтоўнай лоніцы ў працы, неабходна стварыць такія ўмовы, пры якіх членская маса сапраўды магла бачыць у асобе саюзу абарону. Ня ўобра стаіць справа на сяле, в прапаўнікамі сельсаветаў, РВК, якія працуюць «ад золаку да золаку», пры нікчэмнай аплаце працы. Зьезду прыдзецца зьвярнуць асаблівую ўвагу на гэтыя хваравітыя пытаньні.

З другога боку, у зьвязку з набліжэньнем калдагаворнай кампаніі, зьезду прыдзецца сказаць сваё слова, што ня ўсе органы выконвалі калдагаворы—было вельмі шмат канфліктаў.

Зьезд будзе працаваць 4-5 дзён і трэба лічыць, што яму ўдасца знайсьці агульную мову в масай.

3-я ўсебеларуская мастацкая выстаўка.

Наркамасьветы пастанавіў арганізаваць у Менску 3-ю ўсебеларускую мастацкую выстаўку. Адчыненьне выстаўкі будзе дастасавана да дню сьвяткаваньня 10-годзьдзя агалашэньня БССР. У час выстаўкі будзе праведзена 1-я ўсебеларуская канфэрэнцыя мастакоў. Уся падрыхтоўчая праца па арганізацыі выстаўкі і канфэрэнцыі ўскладзена на Галоўмастацтва.

Скарачэньне продажу горкай.

Наркамгандлю БССР пастанавіў праводзіць паступовае скарачэньне сеткі каапэрацыйных крам, гандлёвых хлебным вінам у гарадох і мястэчках гарадзкога тыпу. Пастаноўлена спыніць каапэрацыйны гандаль хлебным віном у акруговых гарадох і 21 мястэчку.

Да пачатку студзеня мяркуецца спыніць продаж віна каапэрацыйнымі крамамі ў 59 мястэчках.

ПАПРАЎКА.

У нумары 240 нашае газэты—за 17-X-28 году—у артыкуле—«Роля інстытуту сялянасьледчыкаў у падвышэньні ўраджайнасьці»—па недагляду карэктуры ўкралася памылка. Надрукавана:... «арганізавана 86 сялян-дасьледчыкаў», а павінна быць—... «862 сялян-дасьледчыкаў».

З лістоў рабселькораў.

НЯ ВЫКОНВАЕЦЦА.

На нарадзе селькораў Пухавіцкага райёну было вынесена пажаданьне, каб пачаць выдаваць райённую насьценгазэту, але гэтае пажаданьне пакуль засталося на паперы.

Райкампарт, зьвярні ўвагу на гэту справу.

Варба.

„БЕЛАРУСІЗУЮЦЦА".

Зусім не пачата праца па беларусізацыі ў Форынскай мытніцы, Полацкай акругі. Цікава, ці пачнецца яна там?

Зал.

РАСПАДАЕЦЦА ГУРТОК.

Ніякай працы не праводзіць селькораўскі гурток вёскі Чобатовічы. Гуртку награжае распад.

Партарганізацыі трэба зьвярнуць увагу на гурток.

Л. Барабанаў.

ТРЭБА НАЛАДЗІЦЬ.

У. М. Ляды пры нардоме маецца радыёпрыёмнік, які ўжо больш двух гадоў сапсаваны і не працуе.

РВК, зьвярні ўвагу!

Мак—скі.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ.

У Клімавіцкай лесапілцы аполкамі пазьвяць печы. Апрача гэтага, загалчык камбінату бярэ сабе штодзённа лесаматар'ялы на дровы.

П. Я.

ЗАГІНУЛА ШМАТ ДУБОЎ.

Па загаду лясьнічага Ціханіцкага лясьніцтва скошана 5 дзесяцін сенажаці, на якіх было каля 1000 маладых дубоў. У час касьбы дубы загінулі.

Мала гэтага, Сена было прызначана для каня лясн-ва, а папала заможнику Палявому і баньку лясьніка —Кавалаву.

Рагачэўскаму РВК трэба зацікавіцца гэтай справай.

Лесавік.

ЧАМУ ГЭТА ТАК?

У вёсцы Рудняе-Альхоўка школа знаходзіцца ў маленькай сялянскай хаты, куды зьмяшчаецца ня больш 25 дзяцей. Між тым, РВК за гэта памяшканьне плоціць гаспадару 10 рублёў у месяц.

Трэба сялянам пры дапамозе, РВК узяцца за будаваньне школы.

А. К.

ДАЙЦЕ ПАКОЙ.

У ляжкіх кватэрных умовах працуе Халопен ніці-нарсуд: канцэляры і прыёмная—ўсё у адным пакоі. Загэтым у канцэлярыі заўсёды поўна народу і нельга працаваць. Неабходна даць пакой нарсуду.

Л.

ДОБРА ПРАЦУЕ.

Чэбатовіцкі камітэт сялянскай узаемадапамогі мае зерначысьцільную машыну і саломарэзку, якімі сяляне карыстаюцца на 70 проц. таней, чымся ў прыватніка. Камітэт таксама разам з камсакольцамі засеяў сабе 3 з пал. гакт. зямлі.

Ведаючы.

НЯДБАЙНЫЯ АДНОСІНЫ.

Нядбайна адносяцца працаўнікі Чачэвіцкай пошты (Магілеўшчына) да агалашэньняў листоў. Быў выпадак, калі селянін в. Шмакі адаслаў ліст і праз некалькі дзён ліст быў яму зварочан завернутым у атрымліваемай газэце.

Неабходна, каму належыць, зьвярнуць увагу.

Я. Крушына.

ЗЬЛІКВІДАВАЛІ.

Пры ячэйках ЛКСБ м-ка Лядны (Аршаншчына) была арганізавана група „Лёгкай кавалерыі". Сябр групы зьвярнуўся да сэкратара Лядненскага райкампарту за дазволам аглядзець сямігодкі, дзе меліся недахопы. Сэкратар райкампарту дазволу ня даў і казаў, што групы зьліквідаваны, з тае прычыны, што вылучаны кіраўнік адмовіўся працаваць.

Знайдзіка.

ШЭФ СЬПІЦЬ.

Ужо больш паўгода, як шэф над Растокоўскім сельсаветам—Аршанскі Акрдзяржстрах—не выяжджаў у свае падшэфныя вёскі і нічога не зрабіў.

Неабходна нашаму шэфу ўзяцца за працу!

Ул. Мак—скі.

РАСТУЦЬ ЎКЛАДЫ.

Добра праведзена кампанія па вярбоўцы ўкладчыкаў у касу ашчадкасьці сярод насельніцтва Рагачэўскага райёну. У выніку, колькасьць укладчыкаў расьце. Напрыклад, у адным Ціхінскім сельсавеце за 2 тыдні прыбавілася 30 укладчыкаў і павысіўся разьмер укладаў.

Я. Кр—на.

Плян сьвяткаваньня

XI-годзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі на Менскай акрузе.

Для падрыхтоўкі і правядзеньня сьвята на прадпрыёмствах і ўстановах у райёнах і пры сельсаветах складаюцца камісіі з прадстаўнікоў партыйных, камсамольскіх, прафэсыянальных і кааперацыйных арганізацый, савецкіх і гаспадарчых устаноў. У абавязкі камісіі уваходзяць:

а) Прыгаженьне шырокіх колаў працоўных, падрыхтоўцы і сьвяткаваньню XI угодкаў.

б) падрыхтоўка мясцовай часткі для кастрычнікавых вечароў;

в) падрыхтоўка дыктрам аб дасягненьнях за год,

г) падрыхтоўка плякатаў і карнавалаў да дэманстрацыі;

д) выпуск насьпенных газэт і высьвятленьне падрыхтоўкі к сьвяту і сьвяткаваньня ў цэнтральным друку.

З 25-га кастрычніка па 6-е лістапада на прадпрыёмствах і ў парадку клюбнай працы адзначыць рабочых, работніц і служачых з рашэньнямі VI кангресу Камінтэрну, з дасягненьнем і задачамі ў галіне самакрытыкі ў галіне сацыялістычнага і культурнага будаўніцтва, з становішчам і задачамі забясьпечаньня рабочых.

У парадку працы хат-чытален, чырвоных куткоў азнаёміць сялянства з рашэньнямі VI кангресу Камінтэрну, з дапамогай улады вясковай бедноце і палітыкай партыі к батрацтву, бедняку і серадняку выкарыстоўваючы мясцовыя прыклады: крадыцтваньне, сельгасп. падатак, прыём дзяцей у школы, дапамога дзецям беднаты і г. д., з задачамі ў галіне паленьваньня працы савецкіх, кааперацыйных і грамадзкіх устаноў, з калектывізацыяй сельскай гаспадаркі і працай с. г. калектываў.

Сьвяткаваньне ў горадзе.

Сьвяткаваньне праводзіцца 7 і 8 лістапада.

а) 6-га ўвечары ў Менску і Барысаве праводзяцца ўрачыстыя пасяджэньні гарсаветаў, у Менску пасяджэньне гарсавету разам з АВК, ЦВК і ЦСПСБ з удзелам партыйнага, прафэсыянальнага, камсамольскага і грамадзкага актыву з пастаноўкай дакладу аб нашых дасягненьнях за год і чарговых задачах, пасьля дакладу мастацкая частка «Мастацтва і культура Беларусі».

б) 7-га дзём дэманстрацыя, прысьвечаная XI угодкам.

в) 7-га ўвечары ўва ўсіх клюбах мастацкія вечары, бясплатныя кіно і тэатры для рабочых, служачых і чырвонаармейцаў.

г) 8-га лістапада—раніцкі для піянэраў, школьнікаў, прысьвечаны X-гадоваму юбілею КСМ і культурнаму паходу вад лозунгам: «Супроць п'янства, хуліганства, вандальшчыны, за кнігу, за газэту, за культурны быт і г. д.».

д) 8-га ўвечары ва ўсіх клюбах і школах вечары моладзі, прысьвечаныя надзвычайнаму пашырэньню вынікаў культпаходу і чарговым задачам у галіне культурнай рэвалюцыі.

Сьвята ў вёсцы.

а) 6 га ва ўсіх райённых цэнтрах пасьля урачыстых пасяджэньні мясцовага савету, разам з РВК, з партыйным, камсамольскім, прафэсыянальным і грамадзкім актывам з дакладам—нашы дасягненьні на фронце сацыялістычнага і культурнага будаўніцтва і далейшыя задачы. Пасьля дакладу мастацкая частка.

б) Ва ўсіх райённых цэнтрах, у вёсках, дзе стаяць вайсковыя часьці, ці ёсьць арганізаваныя сілы, правесьці мітынг 7-га лістапада.

в) 7-га ўвечары ўва ўсіх вёсках арганізаваць урачыстыя сходы з дакладамі—XI год існаваньня савецкай улады, укрэпленьні і перабудова сялянскай гаспадаркі. Пасьля дакладу мастацкая частка.

г) 8-га з раніцы—раніпікі для піянэраў і школьнікаў, прысьвечаныя X-годзьдзю камсамолу і культпаходу пад лозунгам—„супроць самагонакурэньня, супроць п'янства, хуліганства, за пісьменнасьць, за чыстату, за падпіску на газэты, за чысьціню, за культурнае вядзеньне сельскае гаспадаркі".

д) 8-га ўвечары—вечары моладзі з ячэйкай і іх бацькоў з дакладам—аналізацыя вынікі і далейшыя задачы ў галіне культпаходу. Пасьля дакладу мастацкая частка.

КАМІСІЯ.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ.

Паважаны рэдактар!

Не адмоўце зьмясьціць у Вашай газэце наступны ліст:

У апошні час паступаюць масавыя скаргі ад калектываў і паасобных падпісчыкаў-чытачоў на некуратнае і несвачасовае атрыманьне перыядычных выданьняў (як цэнтральных, так і мясцовых), з абвінавачаньнем у большасьці Беларускага Аддзяленьня Выдавецтваў „Известия ЦИК" і «Правда». У сувязі з гэтым Беларускае Аддзяленьне Выдавецтва лічыць сваім абавязкам паведаміць насельніцтва, што непаразуменьні у тэмпы даставкі выданьняў выкліканы непарадкамі, існуючымі на пошце ў частцы газэтнай даставкі: Менская пошта, прымаючы на сябе з 1-9 даставку мясцовых газэт, недастаткова падрыхтавалася да арганізацыі адзінай эксплятацыі для аб'яднаньня даставкі цэнтральных і мясцовых газэт (што было выяўлена абсьледаваньнем НК РСІ).

У сучасны момант, наколькі нам вядома, пошта прымае меры да ўпарадкаваньня гэтай справы, і можна спадзявацца, даставка газэт будзе ўрэгулявана ў бліжэйшай будучыні.

Бел. Аддзяленьне Выдавецтваў „Известия ЦИК" і «Правда».

НОВЫЯ КНІГІ.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі.

1. Полымя № 7. Беларуская часопіс літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі. Стар. 219, цана 1 руб. 25 кап. Выданьне Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

2. «Сельская і лясная гаспадарка». Кн. 6. Стар. 134, цана 1 руб. 25 кап. Выданьне Беларускага Навукова-Дасьледчага Інстытуту сельскае і лясное гаспадаркі імя У. І. Леніна, Народнага Камісарыяту Земляробства і саюзу сялгаслесправаўнікоў Беларусі.

3. «Вестник иностранной литературы» № 9, стар. 159, 1 руб. Дзяржаўнага Выдавецтва Масква -Ленінград.

Апавяшчэньні.

Гаррайшэфпраўленьне паведамляе, што ў нядзелю 21-X а 1 гадз. дню, у памяшканьні Гаррайкому КП(б)Б адбудзецца пасяджэньне Райпраўленьня, на якое запрошаны зьявіцца наступныя т.т.: Рубін (1 друкарня), Яскевіч (Варшавянка), Марнаў (ЦСУ), Гурскі (Працасьветы), Сукоўскі (Усход), Сыратовіч (Акрфа), Курылюк (Эльвод), Сімуніна, Чын, Левін (Меншэй), Шустэр, Сыратовіч (НКП), Аўчыньнікаў (ЦП саюзу сел. гасп. рабочых) Яцунас (№ палка).

Гаррайком КП(б)Б.

— У суботу, 20 кастрычніка г. г. а 5 гадз. дню адбудзецца пасяджэньне бюро ГРК КП(б)Б сумесна з прадстаўнікамі райкому, якія былі вылучаны для ўдзелу ў перавыбарах бюро ячэек па райёну.

На бюро запрашаюцца наступныя т. т. Корф, Фрыдман, Лаўрыновіч, Раманаў. Канакоцін, Шыпіла, Штэйнгарт, Аскоўскі, Цапнаваты, Ледвіч, Хандогі, Вольскі, Васарман, Сукала, Будзінскі, Платун, Гольдбарг, Елін, Шынддер, Хацкевіч, Брушкоў, Глезераў, Мітлін, Сірота, Нусноальтэр, Прошыц, Пятушкоў, Пашневіч, Альтман, Кроль, Калмын, Школьнікаў.

—Сёньня, а 7 гадз. увеч. інструктыўны даклад тав. Мар'ясінай. На тэму: «Кастрычнік у школе».

— У нядзелю 21 кастрычніка, а 7 гадз. дню, у памяшканьні гаррайкому КП(б)Б (Энгельса, 28) адбудзецца агульны сход работнікаў і жонак рабочых полем.

У парадку дню: Даклад аб задачах дэлегацкіх сходаў і выбары дэлегатаў на польскі дэлегацкі сход.

Прысутнасьць абавязковая і без спазьненьня.

— У нядзелю 21 кастрычніка, а 12 гадз., у памяшканьні ГРК КП(б)Б адбудзецца пасяджэньне жансэкцыі Гаррайкому МОПР'у. На пасяджэньне запрашаюцца наступныя т. т. СТАШЭЎСКАЯ, ЛІПМАНАВА, ПУХАВІЦКАЯ, ЛАЗАРЭВІЧ, САВЕЛЬЗОН, ГРЫНГАУЗ (Меншэй), ФОРЫНА, КАГАН, МІЛЬНЭР, ГРЫНГАУЗ, КАРЧЭМНАЯ, КІМЯНСКАЯ, ПУЧКОЎСКАЯ, ІВАНОВА, РУБЕНЧЫК, ЮДЗІНА, КАСЬЦЮК.

Прысутнасьць усіх т. т. абавязкова і без спазьненьня.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

У нядзелю 21-X г. г. роўна а 6 гадз. увечары адбудзецца нарада сэкратароў групкомаў і МК працасьветы.

Яўна ўсіх сэкратароў абавязкова.

Пажадана прысутнасьць сяброў МК.

У НАВУКОВЫМ Т-ВЕ.

У нядзелю 21 кастр. а 5 гадз. увеч. у фізычнай аўдыторыі БДУ адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне Фіз.-Матэм. Сэкцыі, прысьвечанае ПАМЯЦІ праф. А. МІХАЙЛОЎСКАГА.

З дакладамі і ўспамінамі выступяць: праф. Сіроцін, Дыдырка, Патосін і інш.

Уваход вольны.

Да ведама членаў сэкцыі навуковых працаўнікоў.

У нядзелю, 21-X г. г. а 11 гадз. раніцы, у памяшканьні кутку Навуковых Працаўнікоў, адбудзецца агульны сход членаў сэкцыі. Прысутнасьць абавязкова.

У нядзелю, 21-X а 7 гадз. увеч. пасяджэньне праўленьня Дому.

— У нядзелю 21 кастрычніка, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні Пэдфаку, аўд. № 35, адбудзецца пасяджэньне літаратурнай сэкцыі нав. т-ва пры БДУ.

Даклад праф. І. Замоціна: «Русаізм у творчасьці Л. М. Талстога». Бягучыя справы.

— У нядзелю 21 кастрычніка, а 7 а палавай гадз. увечары, у памяшканьні клюбу імя Р. ЛЮКСЭМБУРГ тав. Гэльтман прачытае на вольскай мове рэферат аб антысэмітызьме. Уваход вольны.

Менаркругком КПБ.

Школа № 2-5.

У нядзелю, 21 кастрычніка роўна а 10 гадзіне, у будынку 2-й школы (Ленінская 21) адбудзецца менская вучнёўская школьна-краяз